РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 СНЕЖНЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 239 (30627)

# СПРАВА, ДА ЯКОЙ ЛЯЖЫЦЬ ДУША




У любой сферы маладому спецыялісту патрэбна надзейнае плячо, настаўнік, які падтрымае, а ў сферы аховы здароўя, дзе гаворка ідзе пра здароўе і жыццё людзей, — асабліва. Каб даведацца, хто і як дапамагае маладым урачам асвоіцца ў прафесіі, ці падабаецца ім выбраны прафесійны шлях, карэспандэнты «Звязды» адправіліся ў Валожынскую цэнтральную раённую бальніцу.

**Як уладкаваліся і працуюць маладыя медыкі ў Валожыне**

СТАР. 12–13

Фота Лізаветы ГОЛАД.

З ЯКІМІ ВЫНІКАМІ ЗАВЯРШАЕ ПЯЦІГОДКУ СТАЛІЦА? 4



**Ячшэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

## КРАЙ АДКРЫТЫХ СЭРЦАЎ І ДЗВЯРЭЙ

Гэта сапраўды наша нацыянальная асаблівасць, якая вылучае Беларусь, бадай што, з усіх краін свету. Бо дзе яшчэ такое было, калі ў адказ на санкцыі і адкрыта варожую рыторыку краіна не агароджвалася, а наадварот, гасцінна адчыняла дзверы? Днямі Прэзідэнт падпісаў рашэнне прадоўжыць яшчэ на год бязвізавы рэжым для грамадзян 38 еўрапейскіх краін. І ў гэтым – вялікая жыццёвая мудрасць. Шчыра запрашаем: прыязджайце, глядзіце на свае вочы, каштуйце, судакранайцеся. Нават калі эліты расказваюць страшылкі і размахваюць зброяй – для простых людзей, для народаў мы адкрытыя, бо менавіта яны гэта пра добрасуседскія адносіны. А эліты – сёння ёсць, а заўтра... хто пра іх і ўспомніць?..

Мы адкрываем краіну для гасцей – гэта вельмі значны стымул для развіцця. Нездарма сфера турызму займае ўсё больш упэўненую пазіцыю ў эканамічных разліках.

«Беларусь гасцінная» – брэнд, які пастаянна пацвярджаецца справамі. І гэта ўжо ведаюць ва ўсім свеце.



Працяг тэмы — у матэрыялах нумара.

ISSN 1990 — 763X




Ідзе падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2026 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2026 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА:**

*— Вы нармальна павінны ўспрымаць замежнікаў. Мы ўвялі бязвіз для ўсіх. Для нас там закрываюць усё, а мы ім: «Прыязджайце, глядзіце!» Ну, нагрузка невялікая міліцыі, спецслужбам, але гэта іх работа, грошы ж яны за гэта атрымліваюць. Але сюды ж прыязджаюць не бедныя людзі. Яны прывозяць сюды грошы.*

**Падчас наведвання комплексу «Лошыцкі» ў Мінску, 12 верасня 2025 года.**



# МУДРАСЦЬ НАРОДНАЙ ДЫПЛАМАТЫІ

## Аляксандр Лукашэнка прыняў рашэнне аб прадаўжэнні на 2026 год бязвізу для грамадзян 38 еўрапейскіх дзяржаў

По рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь бязвізавы рэжым уезду ў краіну для грамадзян 38 еўрапейскіх дзяржаў прадоўжаны да 31 снежня 2026 года. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Умовы бязвізавага ўезду застаюцца нязменнымі. Грамадзяне гэтых краін могуць перасякаць дзяржаўную граніцу Беларусі праз усе аўтамабільныя і чыгуначныя міжнародныя пункты пропуску, выкарыстоўваючы дзеючыя дакументы для выезду за граніцу. Тэрмін знаходжання ў Беларусі складае не больш чым 30 сутак з дня ўезду, а для грамадзян Польшчы, Літвы, Латвіі і асоб, якія маюць статус неграмадзяніна Латвіі, — не больш за 90 сутак.

Правам бязвізавага ўезду можна карыстацца неабмежаваную колькасць разоў, пры гэтым агульная колькасць дзён знаходжання па бязвізе не павінна перавышаць 90 дзён у каляндарным годзе.

Захоўваецца таксама бязвізавы парадак уезду праз аэрапорты Беларусі.

Замежныя грамадзяне, якія прыбылі ў бязвізавым парадку, могуць праязджаць транзітам праз краіну, уключаючы паветраныя пункты пропуску, у трэція дзяржавы, за выключэннем Расійскай Федэрацыі.

Гэты парадак не распаўсюджваецца на ўладальнікаў дыпламатычных, службовых, спецыяльных і прыраўнаваных да іх пашпартоў. Уладальнікі біяметрычных дыпламатычных пашпартоў дзяржаў — членаў ЕС могуць уязджаць, выязджаць і праязджаць транзітам праз Беларусь без віз у адпаведнасці з пагадненнем паміж Рэспублікай Беларусь і ЕС аб спрошчанай выдачы віз.

Беларусь застаецца адкрытай для гасцей з-за мяжы і гатова прымаць турыстаў, дзелавых партнёраў. У краіне ствараюцца ўсе неабходныя ўмовы для камфортнага і бяспечнага знаходжання, дэманструецца гасціннасць і добразычлівасць, якія з'яўляюцца неад'емнай рысай беларускага грамадства.

Дарэчы, з 1 студзеня гэтага года ў Беларусь прыбыла больш за 210 тысяч замежных грамадзян з 38 краін, уключаных у спіс бязвізу.

### «БЕЛАРУСЬ — АДКРЫТАЯ КРАІНА, ГАТОВАЯ ДА ДОБРАСУСЕДСТВА З УСІМІ НАРОДАМІ»

Каментуючы рашэнне Прэзідэнта аб прадаўжэнні бязвізавага рэжыму, **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар Гомельскага гандлёва–вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Фармацыя» Людміла САПЕГА** адзначае, што гэты крок накіраваны на развіццё турызму, дзелавых і гуманітарных сувязяў, а таксама на спрашчэнне кантактаў паміж грамадзянамі суседніх дзяржаў.



— Рашэнне беларускага кіраўніцтва рэзка кантрастуе са спробамі ўлад Польшчы і прыбалтыйскіх дзяржаў максімальна абцяжарыць сваім грамадзянам магчымасць наведваць Беларусь,





а таксама абмежаваць беларусаў у праве на свабоду перамяшчэння, — кажа сенатар. — Аднак, нягледзячы на гэта, Беларусь застаецца адкрытай краінай, гатовай да супрацоўніцтва і добрасуседства з усімі народамі. Тое пацвярджаюць і лічбы афіцыйнай статыстыкі: на працягу гэтага года Беларусь па бязвізе наведалі 210 тысяч замежных грамадзян, якім не толькі былі дадзены цвёрдыя гарантыі бяспекі, але і створаны максімальна камфортныя ўмовы для знаходжання ў нашай краіне. Гэта чарговы раз сведчыць: беларусы ні з кім не імкнуцца да канфрантацыі. Мы адкрыты для сяброўства і супрацоўніцтва і праяўляем традыцыйную гасціннасць і ветлівасць да ўсіх, хто прыязджае да нас з чыстым сэрцам і адкрытай душой, заключае парламентарый.

Беларусь падала чарговы прыклад добрасуседства і міралюбнасці, аднак улады краін Балтыі і Польшчы, хутчэй за ўсё, працягнуць рабіць стаўку на канфрантацыю. Пра гэта ў ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» заявіў **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, навуцы і культуры Сяргей КЛІШЭВІЧ**.



Парламентарый звяртае ўвагу, што большасць з тых 210 тысяч замежнікаў, хто заехаў у Беларусь па бязвізе, — вядома, грамадзяне Польшчы, Літвы і Латвіі:

— Наш прынцып адкрытасці эфектыўны. Заходнія палітыкі спрабуюць пераканаць сваё грамадства ў тым, што ў Беларусі небяспечна і дрэнна, але ўсё гэта разбіваецца аб рэальныя кантакты грамадзян з нашай краінай. Бачачы гэта, напрыклад, тыя ж літоўскія палітыкі шалеюць, прыдумляюць розныя правакацыі на граніцы з мэтай застрашвання народа. Гэта ім трэба, каб апраўдаць канфрантацыю з Беларуссю і Расіяй. Але людзі разумеюць, што ўласныя ўлады іх падманваюць і што дзеянні палітыкаў вядуць да пагаршэння сацыяльнага становішча па многіх кірунках. Як адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка (на пасяджэнні Савета бяспекі, якое адбылося напярэдадні. — **«Зв.»**), раней 30 % бюджэту Літвы фарміравалася як мінімум за кошт патоку нашых грузаў. Цяпер гэтага няма. І літоўскія ўлады, хутчэй за ўсё, працягнуць здзяйсняць неапраўданыя, неабдуманыя дзеянні.

Беларусь жа мае намер заставацца адкрытай, падкрэсліў госць праграмы:

— Мы сістэмна праводзім палітыку добрасуседства. Чарговае прадаўжэнне бязвізу пацвярджае, што мы гатовы з усімі сябраваць і ўзаемавыгадна супрацоўнічаць. У інтарэсах людзей гатовы наладзіць дыялог нават з цяперашнімі, адарванымі ад народа, літоўскімі палітыкамі. Але яны, хутчэй за ўсё, працягнуць нагнятаць абстаноўку. Пры гэтым простыя грамадзяне працягнуць прыязджаць да нас. Гэта важна. Бо чым больш людзей прыедзе, тым больш з іх даведаецца праўду пра тое, што насамрэч адбываецца ў







Беларусі. І гэту лічбу можна памножыць як мінімум на пяць, паколькі ва ўсіх ёсць сваякі, знаёмыя, сябры.

Парламентарый перакананы, калі ў грамадстве Літвы, Латвіі, Польшчы назапасіцца крытычная маса тых, хто будзе ведаць праўду і не будзе ісці на павадку ў палітыкаў, гэта стане прамой пагрозай для эліт:

— Улады краін Балтыі і Польшчы прымаюць недарэчныя рашэнні, накіраваныя супраць сваіх жа людзей. Гэта становіцца відавочным для ўсё большай колькасці грамадзян.

## ГАТОВЫ ДА СТРАТЭГІЧНАГА ДЫЯЛОГУ



У сваю чаргу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алег ДЗЯЧЭНКА** звяртае ўвагу, што сёння ў беларускім грамадстве шырока абмяркоўваюцца ключавыя падыходы, мэты, прыярытэты і індыкатары, выкладзеныя ў Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2026—2030 гады. Найважнейшым з іх з'яўляецца сёмы прыярытэт, які закранае пытанні маштабнай рэалізацыі турыстычнага патэнцыялу, павышэння ўнёску сферы турызму ў эканоміку нашай краіны, у тым ліку павелічэнне ў два разы аб'ёму экспарту турыстычных паслуг.

**— У сувязі з гэтым рашэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі падоўжыць да 31 снежня 2026 года бязвізавы рэжым уезду ў нашу краіну для грамадзян 38 еўрапейскіх дзяржаў з'яўляецца не толькі палітычна правільным, але і эканамічна абгрунтаваным, які стварае прававыя ўмовы для дасягнення мэт і задач сёмага прыярытэту,**

— падкрэслівае парламентарый. — Беларусь зацікаўлена ў павелічэнні турыстычнага патоку, які, як вядома, з'яўляецца адным з эфектыўных інструментаў народнай дыпламатыі.

Ён канстатуе: гісторыка-культурны, дзелавы, прамысловы, паляўнічы, рэлігійны, лячэбна-аздараўленчы, медыцынскі, экалагічны і іншыя віды турызму дазваляюць звычайным еўрапейцам асабіста азнаёміцца з гістарычнымі і прыроднымі славутасцямі гасціннай беларускай зямлі, атрымаць якасныя медыцынскія і рэкрэацыйныя паслугі.

— Самае галоўнае — яны атрымаюць выдатную магчымасць на працягу ўсяго наступнага года самастойна ўбачыць усе перавагі беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця і пабудовы сацыяльна-арыентаванай дзяржавы для простага народа, «паспрабаваць на смак» тыя сацыяльныя дасягненні, пра існаванне якіх ужо даўно забыліся ў сучаснай Еўропе: бяспека, чысціня і парадак у грамадскіх месцах, доступ да якасных медыцынскіх паслуг, адукацыі і культуры, грамадзянскі мір, міжнацыянальная і міжканфесійная згода ў грамадстве, — падкрэслівае суразмоўца.

На яго думку, у перспектыве менавіта дзякуючы народнай дыпламатыі, у тым ліку і развіццю ўсіх відаў турызму з удзелам простых еўрапейцаў, заходнія палітыкі ўсё ж усвядомяць неабходнасць дэпалітызацыі эканамічных сувязяў і аднаўлення ўзаемавыгадных абласцей супрацоўніцтва, забеспячэння прадказальнасці эканамічнай дзейнасці ў інтарэсах перш за ўсё сваіх народаў і краін.

— Нягледзячы на разыходжанні ў падыходах да вырашэння многіх еўрапейскіх праблем, Беларусь па-ранейшаму рэалізуе палітыку адкрытасці і заўсёды гатова да стратэгічнага дыялогу з усімі разумнымі палітыкамі краін Еўрапейскага Саюза, а таксама да сумеснага пошуку шматбаковых рашэнняў па пытаннях рэгіянальнай і глабальнай бяспекі, — рэзюмуе намеснік старшыні профільнай камісіі.

## ВЫСОКАЯ ГАТОЎНАСЦЬ



Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН правёў чарговае пасяджэнне аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні пасяджэнняў VII Усебеларускага народнага сходу.

Як паведамілі ў прэс-службе ўрада, на пасяджэнні былі разгледжаны бягучыя пытанні падрыхтоўкі другога пасяджэння УНС. Зацікаўленымі была пацверджана гатоўнасць рэалізаваць усе раней запланаваныя падрыхтоўчыя мерапрыемствы ў поўным аб'ёме.

Ва ўрадзе дадалі, што па выніках пасяджэння аргкамітэтам былі прыняты неабходныя рашэнні.

Нагадаем, што другое пасяджэнне сёмага УНС адбудзецца 18 і 19 снежня 2025 года.

**Працяг тэмы — стар. 4–5**

# «ПРАЦАВІТАСЦЬ І ДОБРАСУМЛЕННАСЦЬ ДАЗВАЛЯЮЦЬ ДАСЯГАЦЬ ВЫСОКІХ ПАКАЗЧЫКАЎ»

## Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын уручыў дзяржузнагароды

У сераду ў Палацы Рэспублікі прайшла ўрачыстая цырымонія ўручэння дзяржаўных узнагарод прадстаўнікам розных сфер: падатковых органаў, аграпрамысловага комплексу, лясной і жыллёва-камунальнай гаспадаркі, статыстыкі, адукацыі, культуры і іншых. Адпаведныя распараджэнні і ўказы падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Уручыў узнагароды Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН.



«Мы ўзнагароджваем людзей, якія сваім талентам і самаадданай працай уносяць значны ўклад ва ўмацаванне і развіццё нашай роднай Беларусі. Кожны з вас — прыклад высокага прафесіяналізму, узор вернасці і служэння сваёй справе. Дзяржава па заслугах ацаніла ваш уклад», — звярнуўся да прысутных кіраўнік урада.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што гэтыя дасягненні служаць падмуркам для далейшага росквіту нашай дзяржавы, робяць нашу краіну мацнейшай, умацоўваюць яе суверэнітэт. «Сваёй сумленнай працай вы натхняеце моладзь і дэманструеце, што працавітасць і добрасумленнасць дазваляюць дасягаць высокіх паказчыкаў, умацоўваючы адзінства беларускага народа», — падкрэсліў Аляксандр Турчын.

Ад імя ўрада і ад сябе асабіста Прэм'ер-міністр павіншаваў удзельнікаў цырымоніі з гэтай знамянальнай падзеяй.

«Сённяшняя ўзнагарода — не проста ацэнка вашых заслуг. Гэта пацвярджэнне таго, што краіна бачыць, цэніць і разлічвае на такіх людзей, як вы. Ваша праца — уклад у падмурак нашай агульнай будучыні, арыенцір для маладога пакалення. Няхай гэтыя ўзнагароды стануць для вас крыніцай сіл і стымулам да новых дасягненняў на карысць краіны і беларускага народа. Жадаю вам моцнага здароўя, невычэрпнай энергіі, дабрабыту і поспехаў у вашай высакароднай працы», — сказаў Прэм'ер-міністр.

Медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны **егер Навагрудскага лясгаса Ігар БАЖКО**. Мужчына 34 гады застаецца верным справе, без якой ужо не ўяўляе свайго жыцця. У маладосці ён спрабаваў сябе ў розных сферах, аднак менавіта праца ў лесе стала прызваннем. Ігар Аляксандравіч не шкадуе нават асабістага часу, заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу, перадаць назапашаны досвед моладзі.

«Атрымліваць узнагароду для мяне вельмі хвалююча, паколькі гэта ў жыцці не часта бывае, — падзяліўся эмоцыямі Ігар Бажко. — Другі раз за службу я тут, у Палацы Рэспублікі. Працую я, безумоўна, не дзеля ўзнагарод, але атрымліваць іх заўсёды прыемна».

У ліку ўзнагароджаных — **апаратар машыннага даення КСУП «Пескаўцы» Лідскага раёна Алена ЦІВІНСКАЯ**. У прафесію жанчына прыйшла 45 гадоў таму. «Я на пенсіі ўжо 17 гадоў, але працую, — расказала яна. — Я люблю сваю працу, і пакуль здароўе дазваляе, не хочацца сыходзіць. Сакрэт майго поспеху — у працавітасці. Выконваць працу трэба якасна і добрасумленна».

Калі даведалася, што будуць уручаць узнагароду такога высокага ўзроўню, — эмоцыі зашкальвалі, падзялілася Алена Антонаўна. «Мною ганарацца дзеці, унукі», — дадала яна.

**Начальнік аддзела статыстыкі г. Наваполацка галоўнага статыстычнага ўпраўлення Віцебскай вобласці Марына ІГНАЦЕНКА** таксама была ўдастоена высокай узнагароды. Штодзённая карпатлівая праца органаў дзяржаўнай статыстыкі, адзначаная на такім высокім узроўні, дае стымул працаваць яшчэ лепш, адзначыла жанчына. «Мой стаж у органах дзяржаўнай статыстыкі складае 25 гадоў. А на пасадзе начальніка працую ўжо 15 гадоў. У мяне добры калектыў, мы разумеем і падтрымліваем адзін аднаго. У тым ліку і таму наша праца была заўважана», — рэзюмавала Марына Мікалаеўна.

**Яна ВАЛАСАЧ.**



ПА СУТНАСЦІ

# ЗАДАЧА НА ПЕРСПЕКТЫВУ



Вялікая камандзіроўка Прэзідэнта па дзяржавах глабальнага Поўдня адлюстравала шмат чаго, а яшчэ і дзейсную эканамічную мадэль Беларусі. Мы можам прапанаваць цікавыя праекты і знакавыя кампетэнцыі розным краінам у розных частках свету. Рахунак развіцця Беларусі на нашу карысць, гэта вельмі важкая акалічнасць.

Канец года, заканчэнне чарговай пяцігодкі — час падвядзення вынікаў, выпрацоўкі планаў і стратэгій. Няма нічога больш дэмакратычнага, чым зрабіць гэта ўсёй краінай. У нашай абноўленай палітычнай сістэме выпрацаваны самы дзейсны і прымальны механізм — агульнадзяржаўны дыялог у фармаце УНС. Гэта насамрэч Беларусь у мініяцюры. Рознагалоссяў па павестцы не здарылася. Толькі абмеркаванні. Як вядома, агульнанародны форум пройдзе праз тыдзень — 18—19 снежня. У першы дзень — Пасланне кіраўніка дзяржавы да беларускага народа і парламента, гэта і канстытуцыйна, і ўжо, можна сказаць, традыцыйна. Адбудзецца шырокае абмеркаванне глабальных і глыбінных пасылаў Першага.

Парадак другога дня і па сутнасці, і па форме плюралістычны. Абмеркаванне і прыняцце праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Гэта самы дакладны і абгрунтаваны сцэнарый развіцця дзяржавы да 2030 года.

Праграма — люстэрка развіцця. Эканамічнага — на будучыя пяць гадоў. І нашай мадэрнізаванай палітычнай сістэмы. Нягледзячы на ўсе знешнія пагрозы, сфарміравана моцная мадэль дзяржаўнага кіравання. Яна дазваляе прытрымлівацца прынцыпу плюралізму і сапраўднага народаўладдзя. Яшчэ летам урад распрацаваў канцэпцыю, пачулі кожнага. Падчас работы над дакументам былі ўлічаны ўсе запыты грамадства: па-першае, прыйшло больш за 70 тысяч водгукаў, па-другое, уплецены передвыбарныя нарaтывы Прэзідэнта. Гэта радуе: у беларусаў актыўная палітычная пазіцыя і давер да ўлады. А вось зацвярджаць праграму будзе УНС — канстытуцыйны орган, які з'яўляецца самым паспяховым варыянтам народаўладдзя.

Тон адносін паміж рознымі інстытутамі ўлады зададзены Першым. Ніхто нікога не замяшчае. Але рознасць меркаванняў карысная. Погляд урада, якому рэалізоўваць планы. І канцэпцыя ад групы аналітыкаў і экспертаў на чале з экс-прэм'ерам, цяперашнім кіраўніком Нацбанка Раманам Галоўчанкам.

Бясспрэчным прагнозным паказчыкам у двух варыянтах з'яўляецца прыярытэт па ўмацаванні абараназдольнасці. Гэта рэаліі сучаснасці, без гэтага немагчымы рух наперад і стабільнасць у грамадстве. Таксама Першы адзначыў і яшчэ адзін элемент бяспекі — разумны падыход да развіцця лічбавага грамадства і эканомікі даных.

Безумоўны прыярытэт — будаўніцтва жылля і ў асноўным — арэнднага, бо зразумела: менавіта яно з'яўляецца трыгерам для размеркавання працоўных рэсурсаў. Мэта Першага — абудзіць правінцыю: трэба вышыцца, каб насамрэч адбыўся ўсплёск развіцця рэгіёнаў.

Змянілася місія самой праграмы. Прэзідэнт задаў выразны сцэнарый — задачы павінны быць максімальна напружанымі, але выканальнымі. Сама філасофія праграмнага дакумента ўшчыльную набліжана да чалавека. Любы беларус можа даведацца, дзе і колькі пабудуюць жылля, дарог, бальніц і школ. Такая інфармацыя вельмі важная і для бізнесменаў — адразу зразумела, куды лепш інвесціраваць.

Краіна загадзя пачала падрыхтоўку да самага плюралістычнага форуму народаўладдзя. Абмеркаванне праграмы развіцця прайшло ў працоўных калектывах, на сустрэчах грамадскіх арганізацый сярод кіраўнікоў і грамадзянскай супольнасці. Гэты працэс кансалідаваў усю Беларусь. Дакумент абмяркоўвалі, дапрацоўвалі і перапрацоўвалі. У выніку засталося абмеркаваць ужо дэлегатам УНС. Гэта самы маштабны інстытут дзяржаўнай улады. І сярод гэтага мноства розумаў беларускага грамадства ніводная рацыянальная прапанова не павінна згубіцца, працэс павінен быць адрэгуляваны — таксама задача ад Першага.

У цэлым жа Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця дэманструе адкрытасць і павінна не толькі стаць навігатарам беларускага шляху на пяць гадоў, але і задаць стратэгічныя арыенціры надалей. Толькі ўсім варта мець на ўвазе: каб дасягнуць вызначанай геалакацыі якаснага развіцця, трэба рухацца наперад кожнаму з нас. Паказчыкі без уцягнутасці людзей так і застануцца прагнознымі лічбамі. А стратэгічная мэта — каб рахунак развіцця Беларусі заўжды заставаўся на нашу карысць. Гэта наша найважнейшая задача.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

БЕЛАРУСЬ БУДУЧЫНІ

# «У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ — ЧАЛАВЕК»

## Дэлегаты УНС — аб праекце Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступную пяцігодку

Адзін з найважнейшых пунктаў на парадку дня другога пасяджэння VII Усебеларускага народнага сходу, якое пачнецца роўна праз тыдзень, — прыняцце Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2026—2030 гады. Упершыню гэты важны дакумент — фактычна план жыцця на наступную пяцігодку прымае УНС у новым канстытуцыйным статусе — найвышэйшага органа народаўладдзя. Дэлегаты УНС з разуменнем усёй адказнасці даверанай ім місіі вывучаюць праект праграмы, рыхтуюць свае заўвагі і прапановы. Мы пацікавіліся іх меркаваннем аб гэтым важным для кожнага жыхара Беларусі дакуменце.



**Дэлегат УНС, член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Надзея ХАЛЬЦОВА:**

— Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2026—2030 гады, якая неўзабаве будзе прадстаўлена на зацвярджэнне дэлегатам VII Усебеларускага народнага сходу, вельмі змястоўная, накіравана на вырашэнне ключавых задач развіцця краіны. Галоўная канцэпцыя новага пяцігоддзя — сфарміраваць самадастатковую і канкурэнтную дзяржаву, у цэнтры ўвагі якой чалавек. Традыцыйна прыярытэтам сацыяльнай палітыкі дзяржавы выступае сям'я. Менавіта сям'я з'яўляецца найважнейшай крыніцай фарміравання і развіцця асобы, узнаўлення чалавечага капіталу, назапашвання і перадачы традыцый, духоўных і маральных каштоўнасцяў. Моцная сям'я — аснова грамадства і інвестыцыі ў сям'ю, у чалавечы патэнцыял — гарантыя поспеху і росквіту дзяржавы. Не будзем забывацца, што ўмацаванне інстытута сям'і і захаванне традыцыйных сямейных каштоўнасцяў — клопат не толькі дзяржавы, але і кожнага з нас.

Мы часта паўтараем, што нам важна, каб дзяржава паспяхова развівалася. На чым будуецца паспяховае развіццё? Вядома ж, на якаснай адукацыі. Тое, што мы пакладзём у аснову адукацыі, як навучым і выхаваем нашых дзяцей, — усё гэта стане вынікам будучыні. Якасная і даступная адукацыя ў нашай краіне з'яўляецца адным з найважнейшых гарантаў сацыяльнай стабільнасці, крыніцай росту інтэлектуальнага, культурнага і духоўна-маральнага патэнцыялу нацыі, выступае асновай усіх пераўтварэнняў, накіраваных на пабудову моцнай і квітнеючай дзяржавы.

Адна з задач, якія знайшлі сваё адлюстраванне ў праграме, — бесперапыннае патрыятычнае выхаванне моладзі на ўсіх этапах яе навучання ва ўстановах адукацыі і працоўных калектывах па месцы працы. Педагагічнай грамадскасці неабходна працягваць курс на далейшае развіццё, прыкладаць усе намаганні для таго, каб нашы дзеці, моладзь шанавалі і любілі сваю Радзіму, імкнуліся здзяйсняць добрыя справы і ўчынкі дзеля яе росквіту. А выхаваць патрыёта, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, можа толькі патрыёт. Паважлівыя адносіны да старэйшага пакалення, умение выбудоўваць дыялог з нашай моладдзю — тыя пастулаты, на якіх можа будавацца і развівацца нацыя. Гэта мост паміж гісторыяй краіны і яе будучыняй.



**Дэлегат УНС, дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава Сяргей ПАЛЯКОЎ:**

— Сказаць, што праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2026—2030 гады атрымаўся завершаным, можна будзе толькі пасля заканчэння УНС, калі гэты дакумент будзе прыняты. Мы не выключаем, што на Усебеларускім народным сходзе дэлегатамі УНС

ПЯЦІГОДКА РАЗВІЦЦЯ

# «ЗАБЯСПЕЧАНА ВЫКАНАННЕ ЎСІХ МЭТАВЫХ ІНДЫКАТАРАЎ»

## З якімі вынікамі завяршае пяцігодку сталіца

За перыяд з 2020 года і да сённяшняга дня Мінск дасягнуў значных вынікаў практычна па ўсіх кірунках. Пра тое, што зроблена і якімі дасягненнямі можна ганарыцца, расказаў старшыня камітэта эканомікі Мінгарвыканкама Аляксандр ЯЎСЕЕЎ.




— Ва ўмовах новай глабальнай рэальнасці ў бягучай пяцігодцы мы забяспечылі эканамічную збалансаванасць і дынаміку росту, — падкрэсліў Аляксандр Яўсееў. — У выніку праведзенай работы па дасягненні задач, абазначаных Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця Мінска на 2021—2025 гады, забяспечана выкананне ўсіх мэтавых індыкатараў сацыяльна-эканамічнага развіцця горада: 40 мільярдаў рублёў інвестыцый з тэмпам росту да паказчыкаў 2020 года 125,9 % прыцягнута ў асноўны капітал, сукупныя паступленні даходаў бюджэту выраслі ў 2,2 раза, тэмп росту намінальнай налічанай сярэднямесячнай заработнай платы склаў 194 %. Індэкс прамысловай вытворчасці — 121,2 %. Экспарт тавараў вырас на 20 %, рознічны тавараабарот — на 43 %, тавараабарот грамадскага харчавання — у 1,7 раза.

Неад'емнай часткай эканамічнай палітыкі горада з'яўляецца стымуляванне прадпрымальніцкай ініцыятывы, стварэнне спрыяльных умоў для ўкаранення інавацый, вытворчасці высокатэхналагічных тавараў, пашырэнне тэхнапаркаў. Так, асноўнай пляцоўкай найбуйнейшага ў краіне Мінскага гарадскога тэхна-




будуць выказаны нейкія прапановы або яны паступяць у сакратарыят і мы будзем іх агучваць. Безумоўна, дакумент поўны і вельмі канкрэтны. Ён вылучае тыя асноўныя кірункі і прыярытэты, якія неабходныя для далейшага развіцця нашай краіны.

Захаванне чалавечага патэнцыялу і яго прымнажэнне — гэта задача любой дзяржавы. Мы пазначаем пэўны ўзровень, які мы хочам дасягнуць праз 5 гадоў. Пытанні дэмаграфіі, працягласці жыцця, укладанні ў будаўніцтва бальніц, паліклінік... Гэта ўсё закладзена ў праграме.

**Дэлегат УНС, дырэктар Ушацкага лясгаса Аляксей АПЁНАК:**



— Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця, якую нам неабходна будзе зацвердзіць на Усебеларускім народным сходзе, вызначаны ключавыя прыярытэты, накіраваныя на дэмаграфічную бяспеку, якасную адукацыю, стварэнне неабходных умоў для жыцця людзей, умацаванне абараназдольнасці дзяржавы, рэалізацыю турыстычнага патэнцыялу. Усе пункты праграмы падзелены па тэмах, але звязаны ў адзінае цэлае. Рэалізацыя аднаго мерапрыемства закранае і рэалізацыю астатніх. Але лічу, што праграма будзе выканана пры ўмове ўсеагульнай зацікаўленасці, бо ў аснову закладзены шэраг момантаў, рэалізацыя якіх без людзей усіх прафесій немагчыма. Адзін з важных прыярытэтаў — моцныя рэгіёны. І для гэтага трэба шмат зрабіць у сельскай гаспадарцы, прамысловасці, сацыяльнай сферы, добраўпарадкаванні і навядзенні парадку на зямлі. І я, як кіраўнік вытворчага прадпрыемства, мэты будучай пяцігодкі праецырую ў першую чаргу на калектыў, які ўзначальваю. Мы прыкладзём усе намаганні для выканання паказчыкаў і задач новага пяцігоддзя.

**Дэлегат УНС, дырэктар УП «Кобрынскае прадпрыемства меліярацыйных сістэм» Васіль ПІЎЧЫК:**



— Для мяне вялікі гонар браць удзел у УНС, на другім пасяджэнні якога будзе разгледжана Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця на будучую пяцігодку. Гэта вынік вялікай работы, бо яна ўключае ў сябе прапановы дэлегатаў і меркаванні жыхароў, якія прагучалі на сустрэчах у рамках дыялогавых пляцовак.

У Брэсцкай вобласці пастаўлены сур'ёзныя задачы: аб'ём прыцягнутых інвестыцый з пачатку пяцігодкі павінен скласці больш за 2 млрд рублёў, і гэта амаль у два разы больш, чым за папярэдні пяцігадовы перыяд.

Не менш амбіцыйныя задачы стаяць і перад родным Кобрынскім раёнам. Тут трэба завяршыць рэалізацыю інвестпраектаў на такіх прадпрыемствах, як ААТ «САЛЕО-Кобрын», ААТ «Кобрынскі інструментальны завод «СІТАМА», у філіяле ААТ «Берасцейскі пекар» Кобрынскім хлебазаводзе. У 2027 годзе таксама плануецца будаўніцтва харчаблока Батчынскай сярэдняй школы, а ў 2028-2029 гг. — будаўніцтва сярэдняй школы ў Кобрыне.

Асаблівае месца ў праграме займае развіццё сельскай гаспадаркі. Стаіць задача павышэння патэнцыялу сельскагаспадарчых зямель шляхам аднаўлення спажывецкіх якасцяў меліярацыйных сістэм, якія былі страчаны за працяглы перыяд эксплуатацыі, і ўцягнення меліяраваных зямель у сельскагаспадарчы абарот. Мы разам са сваім калектывам абавязкова прыкладзём усе намаганні для выканання даведзеных паказчыкаў новай пяцігодкі.

**Дэлегат УНС, кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні сярэдняй школы № 3 імя Л. Ф. Камароўскага г. Чэрвеня Віктар КАЗАЧОНАК:**



— Наўрад ці сёння ў нашай краіне знойдзецца чалавек, які не хацеў бы даведацца пра сваю будучыню, што з ім будзе праз пяць або дзесяць гадоў, пра дабрабыт, умовы працы, як і кім вырастуць яго дзеці, якія будуць перспектывы. Вывучыўшы праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2026—2030 гады, магу з упэўненасцю сказаць, што ў ім прапрацаваны ўсе аспекты, каб жыццё нашых грамадзян стала яшчэ лепшым. Закрануты ўсе пытанні — ад дэмаграфічнага становішча ў краіне, адукацыі, аховы здароўя, стану дарог і жылля да лічбавізацыі і абараназдольнасці. Хочацца адзначыць, што ні адна праграма не будзе рэалізавана без удзелу чалавека, ні адзін штучны інтэлект і робататэхніка не змогуць гэта зрабіць. Толькі дзякуючы мудраму кіраўніцтву, а таксама адказнасці кожнага грамадзяніна можна вырашаць любыя задачы.

**Паводле нашых карэспандэнтаў.**

парка, што на вуліцы Солтыса, 187, плошчай 6,5 гектара была адкрыта ў 2021 годзе шляхам пераўтварэння былога мясаперапрацоўчага завода ў сучасны інавацыйна-вытворчы кластар. У цяперашні час вядзецца работа па далейшым пашырэнні тэхнапарка. За мінулы перыяд пяцігодкі колькасць яго рэзідэнтаў павялічылася да 79, створана і мадэрнізавана звыш тысячы працоўных месцаў, аб'ём вытворчасці інавацыйнай прадукцыі павялічыўся у 3,5 раза.

У Мінску сфарміраваны спрыяльны інвестыцыйны клімат. Штогод у эканоміку горада паступае да 1 мільярда долараў прамых замежных інвестыцый на чысты аснове. У бягучай пяцігодцы за кошт сродкаў замежных інвестараў паспяхова рэалізаваны буйныя праекты, задзейнічаныя ў комплексным развіцці сталіцы.

— Сёлета ў рамках рэалізацыі найбуйнейшага інвестыцыйнага праекта «Паўночны Бераг» быў адкрыты Мінскі міжнародны выставачны цэнтр (вул. П. Мядзёлкі, 24. — **«Зв.»**) агульнай плошчай 42,5 тысячы квадратных метраў. Аб'ект адпавядае самым сучасным патрабаванням буйных міжнародных мерапрыемстваў і павышае статус нашай краіны на знешнім контуры, дэманструючы яе ключавую дзелавую кропку для значных падзей, — дадаў суразмоўнік.

Найважнейшы вынік, які ўдалося дасягнуць дзякуючы эфектыўнай рабоце рэальнага сектара эканомікі, — павышэнне якасці жыцця і дабрабыту мінчан, адзначыў Аляксандр Яўсееў.

— Так, у бягучай пяцігодцы рэальная заработная плата павялічылася на трэць, — удакладніў ён. — У горадзе забяспечваецца сацыяльная стабільнасць. Узровень беспрацоўя ў працаздольным узросце (па метадалогіі МАП) па Мінску захоўваецца ў нізкіх межах: 2,3 % ад колькасці працоўнай сілы (за трэці квартал бягучага года). З апярэджаннем выконваецца задача па павышэнні ўзроўню забяспечанасці насельніцтва жыллём, які ў разліку на аднаго жыхара павялічыўся з 23,2 да 24,7 квадратнага метра. З 2021 года ў эксплуатацыю было ўведзена 3,7 мільёна квадратных метраў агульнай плошчы жылых дамоў. За гэтыя гады 67,5 тысячы сем'яў палепшылі свае жыллёвыя ўмовы.

У сталіцы пастаянна ўдасканальваецца работа пасажырскага транспарту, адкрываюцца новыя маршруты, у аснову фарміравання якіх закладзены прынцып падвозу жыхароў да найбліжэйшых станцый метрапалітэна. У снежні мінулага года ўведзены ў эксплуатацыю ўчастак трэцяй лініі Мінскага метрапалітэна. Вядуцца перадпраектныя работы па ўчастку чацвёртай лініі.

Найважнейшым прыярытэтам палітыкі, якая праводзіцца ў горадзе, застаецца клопат пра здароўе людзей. За 5 гадоў, па словах старшыні камітэта эканомікі Мінгарвыканкама, уведзена ў эксплуатацыю 14 новых буйных аб'ектаў аховы здароўя. Многія з іх, валодаючы ўнікальнымі тэхналогіямі і спецыялістамі, з'яўляюцца адзінымі ў Рэспубліцы Беларусь. Напрыклад, у сталіцы функцыянуюць цэнтры па трансплантaлогіі сусветнага ўзроўню. Акрамя таго, з 2024 года на базе ўведзенага блока і гема-модуля Мінскага навукова-практычнага цэнтра выконваюцца новыя высокатэхналагічныя аперацыі па перасадцы касцявога мозгу і ствалавых перыферычных клетак крыві, чаго раней у краіне не было. Прынятыя меры па павышэнні эфектыўнасці сістэмы аховы здароўя дазволілі павялічыць чаканую працягласць жыцця ў сталіцы да 78 гадоў.

Да таго ж у Мінску ствараюцца ўсе ўмовы для папулярызацыі здаровага ладу жыцця і далучэння гараджан да спорту.

— За апошнія гады ў нас з'явіліся такія аб'екты, як стралковы комплекс і самы вялікі ў краіне скаладром на тэрыторыі Нацыянальнага алімпійскага стадыёна «Дынама», — расказаў Аляксандр Яўсееў. — За кошт фінансавай дапамогі Кітая ў канцы 2024 года ў Мінску адкрыты значны для краіны аб'ект «Басейн міжнароднага стандарту», у сакавіку бягучага года — Нацыянальны футбольны стадыён. За апошнія гады ў Мінску пабудавана і рэканструявана 11 школ і 17 дзіцячых садкоў, 3 інтэрнаты для ВНУ, кадэцкае вучылішча і некаторыя іншыя ўстановы.

Што датычыцца сферы культуры, яе развіццё ў сталіцы арыентавана на захаванне і прымнажэнне нацыянальных культурных каштоўнасцяў і традыцый, культурнага кода беларускай нацыі.

Акрамя таго, у Мінску шмат зроблена ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі з улікам таго, што завяршаецца Год добраўпарадкавання.

— З пачатку года ўсе раёны сталіцы перайшлі на водазабеспячэнне з падземных крыніц, у сістэму водазабеспячэння падаецца толькі артэзіянская вада, — дадаў Аляксандр Яўсееў.

У ліпені 2025 года здадзены ў эксплуатацыю завод па перапрацоўцы смецця ў Мінску, што вырашыць задачу эфектыўнай перапрацоўкі і абясшкоджвання цвёрдых камунальных адходаў, мінімізаваўшы экалагічную небяспеку ад іх назапашвання.

**Яна ВАЛАСАЧ.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белцветмет», Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово. УНН 100088666 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронных торгов**
Адрес: Минский р-н, Новодворский с/с, аг. Гатово, 42/2

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Дизельный вилочный погрузчик EP FD35T-TD27**, 2010 г. в. | **19 656,00** |
| 2 | **Дизельный вилочный погрузчик Goodsense FD35B-X10**, 2012 г. в. | **18 228,00** |

***Цена снижена на 30 %. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены***

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 5 % от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.11.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 24.12.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 23.12.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 29-317-95-42.**
**E-mail: auction@cpo.by**

**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ!**

ОАО «БЕЛБАКАЛЕЯ»

*(юридический адрес: г. Минск, ул. Промышленная, д. 15)*

ИЗВЕЩАЕТ О СОЗЫВЕ **ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

Внеочередное общее собрание акционеров ОАО «БЕЛБАКАЛЕЯ» состоится **29 декабря 2025 года** по адресу: г. Минск, улица Промышленная, дом 15, конференц-зал.

Регистрация участников внеочередного общего собрания акционеров проводится по месту проведения собрания с 13.00 до 14.45 по местному времени.
Начало работы собрания в **15.00**.

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

**1. Об избрании членов наблюдательного совета.**

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, будет составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного по состоянию на 08 декабря 2025 года.

Акционер ОАО «БЕЛБАКАЛЕЯ» принимает участие в работе собрания лично или через своего представителя, действующего на основании доверенности.

Для регистрации на внеочередном общем собрании акционеров при себе необходимо иметь следующие документы:
- акционеру ОАО «БЕЛБАКАЛЕЯ» – документ, удостоверяющий личность (паспорт);
- представителю акционера ОАО «БЕЛБАКАЛЕЯ» – документ, удостоверяющий личность (паспорт), и доверенность, выданную в установленном законодательством порядке.

**Время и место ознакомления** акционеров ОАО «БЕЛБАКАЛЕЯ» с материалами по вопросу повестки дня внеочередного общего собрания акционеров:
- с 08 по 28 декабря 2025 г. в рабочие дни с 9.00 до 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д. 15, приемная;
- 29 декабря 2025 г. – по месту проведения Собрания.

УНП 100025653

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) проводит повторные электронные торги по продаже **шести транспортных средств (легковые седаны GEELY SC7)** одним лотом, бывших в употреблении, принадлежащих **МАРТ** (УНП 100377891) с начальной ценой лота (без НДС) – **20 350,00 бел. руб.** (снижена на 45 %). **Оператор ЭТП –** ООО «ИПМ-Консалт оценка» (УНП 191224638). С порядком оформления участия в аукционе, общими правилами проведения можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by и оператора ЭТП **www.ipmtorgi.by**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 29.12.2025. Дата и время окончания приема заявок:** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by по **24.12.2025 до 17.00**

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу

**Контактные телефоны**: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
**E-mail:** auction@cpo.by

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие **«Витебский областной центр маркетинга»** извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Ч.002.00298** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец**
Открытое акционерное общество **«Витебскоблавтотранс»**, 210601, г. Витебск, ул. Софьи Панковой, д. 1 , тел. +375 (212) 22-80-44.

**Организатор,**
**Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: info@marketvit.by, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 30.12.2025 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 200/С-44994 площадью 2257 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Комсомольская, 27, наименование – административное здание, назначение – здание административно-хозяйственное,

составные части и принадлежности: три пристройки, подвал, сход в подвал, двое ступеней, крыльцо, столбы, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000002000155 площадью 0,1492 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Комсомольская, 27/11 (право постоянного пользования, доля 1/1), назначение зем. участка – для обслуживания административного здания. Ограждение металлическое, инв. № 39036 по адресу: г. Витебск, ул. Комсомольская, 27/11. Регулятор температуры РТ-2010-04, зав. № 0057, инв. № 61190, теплосчетчик ТЭМ-05 МД-32, зав. № 11327, инв. № 2208, циркуляционный насос, инв. № 39046, счетчик электрической энергии ЭЭ 8005/6-К, зав. № 790022, инв. № 10902217, счетчик электрической энергии ЭЭ 8007/3, зав. № 784961, инв. № 10902218, счетчик электрической энергии ЭЭ 8005/2-К, зав. № 790207, инв. № 10902216, счетчик электрической энергии ЭЭ 8005/2-К, зав. № 790243, инв. № 10902216, счетчик холодной воды, инв. № 10902010, находящееся по адресу: г. Витебск, ул. Комсомольская, 27.

Обременение: договор безвозмездного пользования № 7БП сроком с 21.04.2025 по 31.12.2025.

**Нач. цена: 1 456 545,00 бел. руб. без учета НДС.**

**Задаток: 145 654,50 бел. руб.**

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 29.12.2025.**

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов:** в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения эл. торгов и утверждения протокола эл. торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов не позднее 11 (одиннадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета эл. торгов. Расходы Продавца на проведение независимой оценки рыночной стоимости – 1491,21 бел. руб., в т. ч. НДС 20 %.

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество – административные здания и помещения.

Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения.

Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 29 815 51 45



**Могилевский филиал**
**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего**
**ИООО «Омск Карбон Могилев»**

**Электронные торги состоятся 13.01.2026 в 11.00 на электронной торговой площадке GOSTORG.BY**

**Лот № 1**

**Легковой автомобиль TOYOTA CAMRY,** тип кузова – седан, VIN № XW7BF4FK80S069698, г. в. – 2014, р/з 7748 ЕР-6.

**Начальная цена продажи: 41 040,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 4 104,00 бел. руб.**

**Местонахождение:** Могилевская обл., Могилевский р-н, Вейнянский с/с, 36, ИООО «Омск Карбон Могилев» западнее аг. Вейно. Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901.

Срок подачи документов для участия в торгах: **по 09.01.2026 до 12.00.**

Извещение также размещено на торговой площадке GOSTORG.BY.

Извещение о предыдущих торгах было опубликовано в номере газеты «Звязда» от 22.10.2025.

Организатор торгов и оператор ЭТП: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

**Доп. информацию можно получить по тел.: +375222-72-41-14, +37529-624-26-25, на сайте ЭТП www.gostorg.by**


# РУХ НАПЕРАД ПРАЗ ІНАВАЦЫІ І ЯКАСЦЬ

## Як рэалізоўваецца ініцыятыва «Адзін раён — адзін праект» на Іванаўшчыне

У Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці прадпрыемства «Мекасан» ужо даўно стала часткай мясцовага ландшафту — як дарогі, што вядуць праз палеткі, ці вятры, што гоняць па абшарах лёгкую сівізну туману. Але гісторыя гэтая пачыналася вельмі сціпла: у 1967 годзе на яго месцы была невялікая рамонтна-механічная майстэрня, дзе людзі працавалі, спалучаючы інжынерную кемлівасць з вясковай цярплівасцю.






Прайшлі гады, і ў 1992-м прадпрыемства зрабіла крок наперад: асвоіла вытворчасць апырсквальнікаў для падкормкі і абароны сельскагаспадарчых культур — тэхнікі, што стала незаменным памочнікам на палях. З тых часоў «Мекасан» рухаўся ўпарта, мэтанакіравана, нібы добра настроены механізм, што не збіваецца з такта ні пры якіх умовах.

Сёння завод — гэта сучаснае, вядомае сваёй прадукцыяй прадпрыемства. Яно распрацоўвае і выпускае 14 мадэляў паўпрычэпных



штангавых апырсквальнікаў, 2 мадэлі вентылятарных і 3 мадэлі пратручвальнікаў, а ў 2024 годзе тут распачалі выпуск цалкам новай машыны — самаходнага раскідвальніка-апырсквальніка. Гэта ўжо тэхніка з амбіцыямі будучыні, пра якую з гонарам расказваюць інжынеры і якую з цікаўнасцю сустракаюць аграномы.

На прадпрыемстве мэтанакіравана ідуць па шляху нарошчвання аб'ёмаў вытворчасці. Так, за студзень — верасень мінулага года былі выпушчаны 116 апырсквальнікаў розных мадыфікацый, 2 пратручвальнікі і 7 новых раскідвальнікаў-апырсквальнікаў.

Лічбы сухія, але за імі — працоўныя змены, калі вечаровымі гадзінамі за высокімі вокнамі цэха яшчэ бачна святло — людзі застаюцца, каб давесці да ладу апошнюю дэталь. Асноўныя спажыўцы — беларускія сельскагаспадарчыя прадпрыемствы і фермерскія гаспадаркі. Апошнія асабліва цэняць тэхніку «Мекасана» за яе надзейнасць і якасць.

Для таго каб ісці ў нагу з часам, тут актыўна ўкараняюцца інавацыі. Як прыклад — праект «Мекасан-1000».

У 2022 годзе было прынята рашэнне стварыць мабільны самаходны агратэхнічны комплекс з агульным фінансаваннем 1,2 млн рублёў. У 2023-м праект уключылі ў Дзяржаўную праграму інавацыйнага развіцця, былі распрацаваны тэхнічныя ўмовы, атрыманы сертыфікаты адпаведнасці. Вядома, новыя тэхналогіі, павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці — гэта сродкі для прадпрыемства і рост сярэдняй заработнай платы, якая, дарэчы, за апошні год вырасла на 21,8 %.

Як адзначылі ў Іванаўскім райвыканкаме, сёння «Мекасан» забяспечвае каля трох працэнтаў ад агульнай прамысловай вытворчасці раёна. Здаецца, не так і шмат, але важна іншае: прадпрыемства падтрымлівае лагістыку, стымулюе сумежныя сэрвісы, дапамагае гаспадаркам быць больш устойлівымі. Больш за палову акцый таварыства належыць раёну, таму супрацоўніцтва з райвыканкамам тут не проста дзелавое, а сапраўды партнёрскае.




Так «Мекасан» ідзе сваім шляхам — спалучае традыцыі і інавацыі. Прадпрыемства ўпэўнена захоўвае курс на развіццё, якасць і надзейнасць тэхнікі — і рэальна прыносіць у жыццё Іванаўшчыны тое, што называюць простым, але важным словам: рух.

**Міхаіл ДАНІЛКОВІЧ.**
**Фота Кацярыны КУХАРЧУК.**

# АГАРОДНІНА БУДЗЕ ДАСТУПНАЙ

## Не больш чым 0,3 % за месяц: у Беларусі ўстанавілі ліміт росту цэн на агуркі і памідоры

**У нашай краіне ўзяты на кантроль рост цэн на агуркі і памідоры, гэта прадугледжана карэкціроўкамі ў цэнавым рэгуляванні. Новыя нормы ўступілі ў сілу. Для вытворцаў замацаваны максімум цэнавага росту, самастойна яны могуць падняць цану агародніны штомесяц толькі на 0,3 %. Калі больш — цану прыйдзецца ўзгадніць.**

У МАРГ перакананыя, што такая мера зробіць агуркі і таматы даступнымі ў міжсезонне, калі цэны на прадукцыю вырастаюць.

Сярод іншых навацый — скарачэнне пераліку тавараў, якія падлягаюць цэнаваму рэгуляванню, перш было 211 пазіцый, а цяпер — 199.



— Пазіцыі непаўсядзённага попыту альбо паўсядзённага, але якія не аказваюць значны ўплыў на змяненне цэн у краіне — у гэта выключэнне трапілі гумовы абутак, соль, воцат, сода і шэраг іншых пазіцый. Таксама скарочаны рэгуляваныя пазіцыі, напрыклад, рыба марожаная, канцылярскія тавары і сокавая прадукцыя. То-бок, тавары засталіся ў рэгуляванні як пазіцыі, але пералік рэгуляваных тавараў у гэтай пазіцыі звужаны, — распавяла ў эфіры «Першага інфармацыйнага» **намеснік начальніка аналітычнага ўпраўлення Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Беларусі Анастасія КАСЫМАВА.**

Яна адзначыла той факт, што за цэнамі ў краіне назіраюць дыстанцыйна. У прыватнасці, пры Міністэрстве па падатках і зборах працуе цэлы комплекс па маніторынгу ў розніцы. Усе даныя атрымліваюць праз касавае абсталяванне. Кантралёры бачаць, хто накручвае цэны, і паведамляюць у МАРГ для ліквідацыі парушэнняў. Эфектыўнасць прыняцця рашэнняў забяспечвае інфармацыя аб цэнах па 103 таварных групах з больш чым 110 тысяч гандлёвых аб'ектаў. Гэты спіс пастаянна пашыраецца.

Як раней паведамляў **міністр па падатках і зборах Дзмітрый КІЙКО**, профільным міністэрствам рэалізаваны дадатковы інфармацыйны комплекс на базе сістэмы кантролю сістэмы касавага абсталявання:

— Комплекс дазваляе працаваць аператыўна, сёння ён настроены на аналіз штотыднёвай змены ўзроўню цэн з пачатку месяца, з пачатку года. Пры неабходнасці комплекс нават можа быць настроены на штодзённы маніторынг змен ўзроўню цэн.

### У тэму

**У ЛІСТАПАДЗЕ 2025 ГОДА ГАДАВЫ ПРЫРОСТ СПАЖЫВЕЦКІХ ЦЭН СКЛАЎ 7 %**

Гэтыя даныя ўтрымліваюцца ў аглядзе інфляцыі за мінулы месяц ад Нацбанка.

Рэгулятар звяртае ўвагу, што змяненне спажывецкіх цэн у лістападзе бягучага года адносна кастрычніка склала 0,4 %.

Белстат, у сваю чаргу, адзначае, што індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў лістападзе 2025 года ў параўнанні са снежнем 2024-га склаў 106,5 %.

Згодна з прыведзенымі данымі, тэмп росту цэн на харчовыя тавары склаў 109 %, нехарчовыя — 103,1 % і паслугі — 107,1 %.

Базавы індэкс спажывецкіх цэн, які выключае змяненне цэн на асобныя тавары і паслугі, схільныя да ўплыву фактараў адміністрацыйнага і сезоннага характару, у лістападзе 2025-га ў параўнанні з кастрычнікам бягучага года склаў 100,3 %, са снежнем 2024-га — 106,9 %.

# З КАРЫСЦЮ ДЛЯ ГЛЕДАЧОЎ І ДЛЯ СЯБЕ

## Вялікі тэатр выканаў свае абавязкі ў частцы пераходу на новыя ўмовы фінансавання

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка:**

*«Мы дамовіліся: колькі заробіце, столькі ж бюджэта атрымаеце. Больш зарабілі — больш атрымалі. Што зарабілі — тое ваша. 50 % мы даем тэатрам датацый».*

**На пашыранай нарадзе з кіраўніцтвам Савета Міністраў, 14 лютага 2023 года.**

Пра гэта паведаміла генеральны дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Кацярына Дулава напярэдадні адкрыцця Мінскага міжнароднага Каляднага опернага форуму — аднаго з тых праектаў, якія працуюць не толькі на імідж установы, але і на акупляльнасць. Між іншым, сёлета тэатр імкнуўся захаваць (а не скасаваць) асноўныя свае адметныя праекты — і, як аказалася, спрацаваў з карысцю не толькі для гледачоў, але і для сябе.

— Наш тэатр трапляе пад нядаўні ўказ Прэзідэнта: калі зарабляе зверх выдзеленых субсідый, то, адпаведна, дзяржава кампенсуе тую ж суму. Лічба павінна быць вельмі добрая. Вялікі тэатр добра зарабіў і выканаў усе свае абавязкі ў частцы пераходу на новае фінансаванне. Адчулі ўпэўненасць у тым, што нам удасца спраўляцца з гэтай задачай далей. Сёння ўвага да тэатра сапраўды вялізная, адчуваем гэта па фестывалях і форумах, адметных канцэртах, экскурсіях, праграмах для дзяцей (мы працягнем гэту лінію, бо ёсць зацікаўленасць бацькоў і такім чынам мы выхоўваем сваіх будучых гледачоў) — будзем рухацца і ў гэтым кірунку.

Гаворка пра выкананне Указа № 422, які ўстанавіў роўнадолевае фінансаванне тэатраў згодна з прынцыпам 50/50. І адметна, што адным з першых, хто сведчыць пра тое, што гэта ўдалося, — Вялікі тэатр. Ён вялікі не толькі па колькасці месцаў у зале, але і па колькасці артыстаў, якія ўваходзяць у склад балетнай і опернай труп. І, здавалася, яму будзе вельмі няпроста ў новых умовах, бо опера і балет — найбольш складаныя для разумення віды мастацтва, што ствараюцца з разлікам на дасведчаных гледачоў, якіх, магчыма, не так шмат. То-бок гэта не масавыя віды мастацтва, калі ўкладанні гарантуюць прыбытак. Тым не менш тэатру ўдаецца прыцягваць да сябе ўвагу. Нават у 2025-м (калі ўжо было зразумела, што напрыканцы года давядзецца трымаць сур'ёзную справаздачу) запланаваныя прэм'еры адбыліся — акрамя перадкаляднага «Шчаўкунка» была опера «Арлеанская дзева» ў пастаноўцы народнага артыста Расіі Георгія Ісаакяна. Менавіта яна і адкрые Мінскі міжнародны Калядны оперны форум паказамі 11 і 12 снежня. У спектакля ўжо ёсць міжнародныя поспехі: сёлета пастаноўка беларускага тэатра была запрошана на фестываль музычных тэатраў «Бачыць музыку» на новай сцэне Вялікага тэатра Расіі. Іншыя нашы спектаклі ў межах форуму з запрошанымі зоркамі ў галоўных партыях і госці — таксама добры ход, каб прыцягнуць публіку.

Але галоўнае — вынікі 2025 года дазваляюць планаваць прэм'еры 2026-га, сярод іх — опера Вердзі «Набука». Таксама варта чакаць абноўленага балета Мінкуса «Баядэрка». Гэта ўсё патрабуе выдаткаў. Але тэатр павінен прыцягваць «праверанымі» назвамі і ў той жа час спрабаваць нешта новае. Творчыя інавацыі — гэта таксама пра цікавасць, якая ў выніку вымяраецца грашыма.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**



# ПРЫГОЖАЯ ЯЛІНКА

## Больш за тысячу ёлачных кірмашоў адкрыюць лясгасы напярэдадні Новага года

**Традыцыйна набыць сімвал свята прапануюць ва ўсіх рэгіёнах краіны: гандаль будзе арганізаваны як непасрэдна ў лясніцтвах, так і на асобных гандлёвых пунктах у райцэнтрах і гарадах. Ад месца набыцця навагодніх дрэў будзе залежаць і іх цана, паведамілі ў Мінлясгасе і параілі: найбольш бюджэтныя варыянты можна будзе набыць у лясніцтвах.**

**Традыцыйна лясгасы і Рэспубліканскі лясны селекцыйна-насенняводчы цэнтр прапануюць набыць і навагоднія дрэвы ў кадках. Сярэдні кошт дрэў да метра складзе 26,39 руб., ад метра да двух — 32,77 руб.**

**У профільным міністэрстве звярнулі ўвагу, што гаворка ідзе пра сярэдні кошт па краіне, гэта значыць, у асобных рэгіёнах ён можа адрозніваецца ў большы або меншы бок. Як правіла, з-за лагістычных выдаткаў найбольш высокія цэны на навагоднія дрэвы фарміруюцца ў сталіцы.**

**Пры гэтым у дзяржаўных установах навагоднія ёлкі і хвоі можна набыць больш выгадна, чым у прыватнікаў.**

***Сярэдні кошт навагодніх дрэў (па краіне):***

***➢ вышынёй да 1 метра:***

*у лясніцтвах — 10,21 руб.;*

*на складзе лясгаса — 10,68 руб.;*

*на гандлёвых кірмашах — 11,42 руб. (у сваім раёне) і 13,3 руб. (выязны гандаль).*

***➢ вышынёй ад 1 метра да 2 метраў:***

*у лясніцтвах — 12, 65 руб.;*

*на складзе лясгаса — 13, 33 руб.;*

*на гандлёвых кірмашах — 14, 18 руб. (у сваім раёне) і 16,78 руб. (выязны гандаль).*

***➢ вышынёй ад 2 метраў да 3 метраў:***

*у лясніцтвах — 18,94 руб.;*

*на складзе лясгаса — 19,56 руб.;*

*на гандлёвых кірмашах — 20,65 руб. (у сваім раёне) і 24,29 руб. (выязны гандаль).*



# НАЙВЫШЭЙШАЯ КАШТОЎНАСЦЬ — ДЗЕЦІ

## Якая яна — беларуская сям'я — у лічбах, расказалі ў Мінпрацы і сацабароны

**Цікавыя факты аб перавагах і каштоўнасцях беларускіх сямей агучылі ў профільным міністэрстве.**

Так, для **68,8 %** беларусаў найвышэйшая жыццёвая каштоўнасць — дзеці, для 65,1 % — сама сям'я.

Летась было заключана **46,2 тысячы шлюбаў.** Сярэдні ўзрост уступлення ў **першы шлюб — 26,7 года**, **паўторны — 40,3 года.**

**Кожнае 4-е дзіця** ў Беларусі нараджаецца **ў шматдзетнай сям'і.**

**Памер сямейнага капіталу** для шматдзетных сем'яў у 2025 годзе складаў **33 275 рублёў.** Дарэчы, з моманту яго з'яўлення — з 2015 года — ім ужо скарысталіся 150,6 тысячы сем'яў.

За апошняе дзесяцігоддзе колькасць сем'яў, якія **выхоўваюць траіх і больш дзяцей**, вырасла на **70 %**.

**100 % дзяцей да 3 гадоў атрымліваюць штомесячныя дапамогі**, якія складаюць **931,91 рубля на першае дзіця** і **1065 рублёў — на другое.**

Дарэчы, бацькі плацяць за дзіцячы садок усяго 13—17 % ад яго рэальнага кошту (для шматдзетных — зніжка 50 %).

Папулярнасць кароткатэрміновага «бацькоўскага водпуску» працягласцю да 14 дзён вырасла **з 2 % у 2020 годзе, да 10 % — у 2024-м.**

Рэпрадуктыўныя планы мужчын напрамую ўплываюць на верагоднасць нараджэння дзяцей у сям'і.

Пры цвёрдым намеры бацькі завесці дзіця гэта верагоднасць узрастае ў 7,6 раза.

У 2025 годзе далучылася ў 1,5 раза больш арганізацый да ініцыятывы «Кампанія, дружалюбная бацькам» (у параўнанні з мінулым годам).

Дарэчы, калі разглядаць пазіцыі нашай краіны ў міжнародных рэйтынгах, якія датычацца мацярынства і дзяцінства, першы намеснік міністра працы і сацабароны Таццяна Астрэйка не так даўно прывяла даныя міжнародных рэйтынгаў, якія пацвярджаюць пазіцыі Беларусі як краіны, спрыяльнай для сям'і і мацярынства.

Так, у рэйтынгу самых камфортных краін для мацярынства Беларусь заняла 25-е месца з 179 дзяржаў. У рэйтынгу арганізацыі цяжарнасці і родаў — 50-я пазіцыя.

Беларусь паднялася на 40-е месца са 180 краін свету ў рэйтынгу найлепшых краін для нараджэння дзіцяці (па выніках 2024 года), апярэдзіла ў ім многія краіны Усходняй Еўропы.

Што датычыцца значных дасягненняў нашай краіны, то ўзровень малазабяспечанасці сем'яў з дзецьмі знізіўся **з 7,3 % да 5,3 % за 2019—2024 гады.**

Фінансавая падтрымка сем'яў — таксама на вышыні. Выдаткі на дапамогі ў 2025 годзе складуць **3,7 мільярда рублёў** — гэта каля **1,5 % ад ВУП краіны.** Сістэма ўключае 11 відаў дапамог для сем'яў з дзецьмі.



# АКЦЭНТ НА РАЗВІЦЦЁ

## Урады Беларусі і Кітая падпісалі Пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне развіцця

**Подпісы пад дакументам паставілі міністр эканомікі Беларусі Юрый ЧАБАТАР і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Чжан Вэньчуань, паведамілі ў прэс-службе Мінэканомікі.**

Тут растлумачылі, што пагадненнем прадугледжана прадстаўленне Урадам КНР тэхніка-эканамічнай дапамогі Ураду Рэспублікі Беларусь для рэалізацыі праектаў, якія будуць узгоднены бакамі, уключаючы невялікія і прыгожыя праекты з невялікімі аб'ёмамі дапамогі, якія характарызуюцца кароткімі тэрмінамі рэалізацыі і сацыяльнай скіраванасцю.

Дарэчы, падчас свайго выступлення на 25-м пасяджэнні Савета кіраўнікоў краін ШАС Старшыня КНР Сі Цзіньпін адзначыў, што Кітай плануе рэалізаваць сто невялікіх, але прыгожых сацыяльна значных праектаў па павышэнні дабрабыту ў дзяржавах — членах ШАС і забяспечыць для іх рэалізацыі бязвыплатную дапамогу.

> **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА:**
>
> *— Гэтыя звар'яцелыя закрылі граніцу на захад. Ну, добра. Нашы ездзілі ў Піцер, у Маскву... у Казань паехалі... Ніхто іх не стрымлівае. Самалёты, верталёты, цягнікі, аўтобусныя маршруты — яны вельмі ў нас запатрабаваныя. А ў расіян запатрабаваная Беларусь, — сказаў кіраўнік дзяржавы.*
>
> *Напрыклад, расіяне — на першым месцы сярод наведвальнікаў турыстычных аб'ектаў у Беларусі. Вялікім попытам карыстаюцца і беларускія гасцініцы, запатрабаваныя медыцынскія паслугі.*
>
> **На сустрэчы з губернатарам Растоўскай вобласці Расіі Юрыем Слюсарам, 17 лістапада 2025 г.**

ПРЫЯРЫТЭТЫ

# ГАСЦІННА ЗАПРАШАЕМ

## Турыстычны патэнцыял Беларусі, або Да чаго праяўляюць цікавасць турысты

Сёння турызм з'яўляецца прыярытэтным кірункам для многіх дзяржаў, бо гэта сфера спрыяе эканамічнаму росту, стварэнню працоўных месцаў і ў цэлым развіццю рэгіёнаў. У будучую пяцігодку раскрыццё турыстычнага патэнцыялу для Беларусі — нацыянальны праект.

Амбіцыйную планку — падвоіць унёсак галіны ў эканоміку і давесці яе долю ў ВУП з 2 да 4,5 % да 2030 года — задаў Указ Прэзідэнта «Аб удасканаленні дзяржаўнага кіравання ў сферы турызму». Ужо з 2026 года ў Беларусі з'явіцца цэнтральнае звяно рэгулявання — Нацыянальнае агенцтва па турызме, якое будзе падпарадкоўвацца наўпрост Савету Міністраў.

Што датычыцца вынікаў на сённяшні дзень, уязны турызм у Беларусі расце, а з ім і экспарт турыстычных паслуг. Эксперты прагназуюць, што да канца года колькасць гасцей можа дасягнуць 8 мільёнаў чалавек.

А як выглядае ў лічбах аб'ём экспарту турпаслуг? У студзені—верасні гэтага года ён склаў 295 мільёнаў долараў, што на 43 % больш, чым за аналагічны перыяд летась. Гэта ў той час, калі мінулы 2024-ы быў рэкордны — тады за год экспарт турпаслуг дасягнуў 268 мільёнаў.

### ЗА ЧЫМ ЕДУЦЬ У БЕЛАРУСЬ?

У адзінай нацыянальнай класіфікацыі 13 відаў турызму. У ліку найбольш запатрабаваных — лячэбна-аздараўленчы і аграэкатурызм. Цэняць госці нашай краіны шырокія магчымасці гісторыка-культурнага, экалагічнага, адукацыйнага турызму, набірае папулярнасць прамысловы. Разам з тым да 70 % усяго турпатоку прыпадае на Мінск, Мірскі і Нясвіжскі замкі, Брэсцкую крэпасць-герой, мемарыяльны комплекс «Хатынь», Нацыянальныя паркі. Асноўны пік турыстычнай цікавасці — з мая да верасня, а яшчэ перыяд навагодніх і калядных свят. Сярэдняя працягласць уязнога тура доўжыцца 4 дні. Да 40 % падарожжаў здзяйсняецца на тэрмін менш за суткі.

Ва ўнутраным турызме дамінуюць самастойныя вандроўкі: у 2024 годзе гэта амаль 94 % ад агульнай колькасці турыстаў.

Часцей за ўсё ў нас бываюць госці з Расіі, Латвіі, Літвы, Эстоніі і Кітая. У тым ліку прыкметна вырас турыстычны паток з дзяржаў, чые грамадзяне могуць прыехаць у Беларусь без візы. Сёлета гэта каля 210 тысяч замежнікаў з 38 краін. Большасць падарожнікаў — нашы суседзі: Літва, Латвія і Польшча.

Мы зарабляем, у той час пакуль улады гэтых дзяржаў вызначаюцца з «адкрыццём-закрыццём» граніц, а турыстычная галіна нясе каласальныя страты, зрэшты, як і астатнія, хто моцна залежыць ад трансгранічных патокаў.

Што датычыцца суседзяў з Усходу, у нас яны бываюць з зайздроснай рэгулярнасцю. Добрае транспартнае паведамленне гэтаму спрыяе, тым больш што з 15 снежня паміж Мінскам і Масквой будзе курсіраваць больш штодзённых цягнікоў «Ластаўка». З 15 расійскімі рэгіёнамі Беларусь звязваюць і прамыя авіязносіны. А наогул беларускі авіяперавозчык за апошні год не слаба пашырыў лётную геаграфію. Нарасцілі палёты з Кітаем. Летась гэта быў усяго адзін прамы авіярэйс, сёння з Мінска адпраўляемся ў Пекін, Урумчы, Сіань і Санья. Прамыя авіярэйсы звязваюць беларускую сталіцу са Шры-Ланкой, В'етнамам і Аманам, а са студзеня ляцім без перасадак у Ізраіль і Тайланд. І, вядома, чакаем у сябе гасцей з гэтых краін.

### ЧЫМ ЗДЗІВІМ ГАСЦЕЙ У НАВАГОДНІЯ СВЯТЫ?

Падчас зімовых свят па ўсёй Беларусі пройдзе мноства мерапрыемстваў: цырыМоніі запальвання агнёў на ёлках, кірмашы, шэсці Дзядоў Марозаў і Снягурак, навагодні аўтапарад, музычныя паказы.

Дзед Мароз, Зюзя, Зімнік і іх казачныя памочнікі традыцыйна сустракаюць гасцей у сваіх сядзібах ва ўсіх рэгіёнах краіны.

У галоўным маёнтку Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы святочныя мерапрыемствы стартавалі 6 снежня: у сядзібу прыехала Снягурка і спецыяльны госць — Усерасійскі Дзед Мароз з Вялікага Усцюга.

Партызанскі Дзед Мароз запрашае ў комплекс партызанскай славы «Хаваншчына», размешчаны ў Івацэвіцкім раёне Брэсцкай вобласці.

Дарэчы, знешнасць у партызанскага Дзеда Мароза асаблівая: барада з пакулля, на галаве — шапка-вушанка, а на нагах — валёнкі, ён у кажуху і з партупеяй. У руках трымае посах, увянчаны чырвонай зоркай, і рэчмяшок з падарункамі.

Па традыцыі рэзідэнцыя Дзеда Мароза адкрыецца таксама і на Лініі Сталіна. Там, акрамя звычайнага ўбору, Дзед Мароз таксама носіць парадны: да звыклага футра дададзеная вайсковая атрыбутыка — каракулевы каўнер і такая ж шапка з чырвонай зоркай.

Ёсць яшчэ Зюзя, якога завуць прадзедам Дзеда Мароза, ён сустрэне гасцей у Нацыянальным парку «Прыпяцкі», комплексе «Азяркі» (Пастаўскі раён Віцебскай вобласці).

Дарэчы, у старажытнаславянскай міфалогіі Зюзя — бог зімы. Яго прадстаўлялі белабародым дзядком нізкага росту, у лютыя маразы ён хадзіў басанож у белым футры з жалезнай булавой.

Таксама сядзіба Дзеда Зімніка і Бабы Завірухі расчыніць свае дзверы ў вёсцы Залейкі Іўеўскага раёна, што на Гродзеншчыне.

Зімнік — родны брат Дзеда Мароза. Добры чараўнік у дакладнасці падобны на знакамітага сваяка. Сцвярджаецца, што менавіта ён прыносіць снег і сцюжу.

**Па матэрыялах news.by і БелТА.**













## ІНДЭКС «АЛІЎЕ»

### У МАРГ падлічылі, колькі будзе каштаваць традыцыйная навагодняя салата

Падрыхтоўка па класічным рэцэпце (у разліку на паўнавартасны салатнік) абыдзецца ў 11 рублёў, паведамілі на «Першым інфармацыйным».



Палічылі вараную каўбасу, бульбу, моркву, рэпчатую цыбулю, куРыныя яйкі, салёныя агуркі, кансерваваны гарошак і маянэз.

У міністэрстве адзначаюць, што выніковая цана можа нават нязначна змяніцца да канца снежня, у тым ліку ў бок зніжэння за кошт дадатковых акцый і спецыяльных прапаноў.

**У тэму**

## СМАЧНА ЕСЦІ!

### Месяц гастранамічнага турызму праходзіць у нашай краіне. І прывабнасць падобнага адпачынку толькі расце

**Пра гэта паведамілі на прэс-канферэнцыі «Нацыянальная кухня — візітная картка Беларусі: захаванне традыцый у месяц гастранамічнага турызму».**

**Намеснік дырэктара Нацыянальнага агенцтва па турызме Ганна ВАШЧЫНЧУК** адзначыла, што летась 359 удзельнікаў заявілі пра сябе ў месяц гастранамічнага турызму і прэзентавалі свае напрацоўкі.

— Сёлета павялічваецца колькасць жадаючых паўдзельнічаць і стаць пляцоўкай для дэгустацый страў беларускай кухні, — цытуе яе БелТА. — Кажуць, калі няма чым турыста здзівіць, яго трэба абавязкова смачна накарміць: тады ён, сыты і задаволены, будзе зусім іншым поглядам глядзець на краіну. Беларусы — гасцінная нацыя, і мы заўсёды рады накарміць і здзівіць госця, — адзначыла Ганна Вашчынчук.

Яна нагадала, што па замове Нацыянальнага агенцтва па турызме ў краіне правялі маркетынгавае даследаванне на тэму «Гастранамічны турызм у Рэспубліцы Беларусь: дасягненні, актуальныя пытанні і перспектывы развіцця». Беларуская кухня ў першую чаргу асацыіруецца з дранікамі, і многія ўстановы эксперыментуюць з традыцыйнымі рэцэптамі, дадаюць новыя прадукты. У аграсядзібах аднаўляюць кулінарныя традыцыі сваіх рэгіёнаў, праводзяць майстар-класы, дэгустацыі. Адчыняюць дзверы для наведвальнікаў вытворцы прадуктаў харчавання.



— Тое, што турыст паспрабаваў, ён запомніць, прывязе дадому гастранамічны сувенір, а не толькі магніт. Гастранамічны складнік вельмі важны як пазіцыянаванне нацыянальнага брэнда: у нас якасныя, смачныя, экалагічна чыстыя прадукты, — звярнула ўвагу спецыяліст.

Месяц гастранамічнага турызму аб'яўляецца ўжо другі год. Ім невыпадкова абраны снежань: у гэты перыяд праходзяць калядныя і перадnavагоднія кірмашы.

— Беларуская кухня вельмі цікавая, багатая. Яе трэба вывучаць, у тым ліку і рэгіянальныя адрозненні, — адзначыла Ганна Вашчынчук.

Дарэчы, у Беларусі зацверджана дарожная карта па развіцці гастранамічнага турызму. Сёлета яна актуалізавана, змяшчае мерапрыемствы, якія накіраваны на папулярызацыю нацыянальнай кухні.

— Акрамя меню, у аб'ектах грамадскага харчавання ўдзяляем вялікую ўвагу інтэр'еру, стварэнню атмасферы, якая адлюстроўвае беларускі каларыт. Фарміруем і прасоўваем турыстычныя маршруты з наведвання гастранамічных лакацый або тых, якія спецыялізуюцца на гатаванні страў пэўнага рэгіёна, — расказала **консультант аддзела метадалогіі ўпраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання МАРГ Ірына ЛІШАЙ.**

Паводле яе слоў, сёлета ў рэгіёнах прайшло 281 падзейнае мерапрыемства, адпрацавана 95 тураў з гастранамічным складнікам, у тым ліку 34 гастранамічныя праграмы, распрацаваны яшчэ шэсць новых (па Навагрудскім і Іўеўскім раёнах, «Валожынскія гасцінцы», «Спадчына Нарачанскага краю», якія ўключаюць майстар-класы па выпечцы хлеба, дэгустацыі, пачастункі, і іншыя).

# ДЗЕЛЯ АБАРОНЫ ДЗЯЦЕЙ

## Хто кандыдат на псіхалагічнае сумоўе?

**5 снежня 2025 года прынята пастанова Савета Міністраў, якой кіраўнікам прадастаўлена права прымаць рашэнне аб правядзенні псіхалагічнага сумоўя педагогаў, трэнераў, выхавальнікаў і іншых спецыялістаў, якія ўзаемадзейнічаюць з дзецьмі. Што гэта за новаўвядзенне, чаму наспела неабходнасць прымаць гэты дакумент і якім будзе механізм яго дзеяння, расказвае намеснік міністра адукацыі Кацярына ПЯТРУЦКАЯ.**



### ДАДАТКОВЫ ІНСТРУМЕНТ АБАРОНЫ ДЗЯЦЕЙ

Па словах Кацярыны Аляксандраўны, неабходнасць прыняцця дакумента была прадыктавана адзінай мэтай — абаронай дзяцей.

— Псіхалагічнае сумоўе трэба разглядаць як дадатковы фільтр у гэтай важнай місіі, — тлумачыць яна. — Такая мера звязана са спецыфікай работы з дзецьмі і асаблівай уразлівасцю іх да негатыўнага ўздзеяння дарослых, якія з імі працуюць. Дарэчы, пералік спецыяльнасцяў не абмяжоўваецца толькі педагогамі, ён уключае ў сябе ўсіх работнікаў, якія працуюць з дзецьмі, выконваюць выхаваўчыя функцыі і гэтак далей.

Сумоўе, як сцвярджае намеснік міністра, не абавязкова праводзіць у дачыненні да абсалютна ўсіх работнікаў.

— Рашэнне аб неабходнасці такой працэдуры прымае кіраўнік установы, напрыклад дырэктар школы або загадчык дзіцячага садка, — кажа яна.

І гэта вельмі важна, таму што падстаў для такога рашэння павінны быць важкімі.

— Гэта можа быць негатыўная характарыстыка кандыдата з папярэдняга месца працы або вучобы, — пералічвае Кацярына Пятруцкая. — Інфармацыя, якая вызывае сумневы ў прафесійных, дзелавых або маральных якасцях. Ці калі ў дачыненні да работніка паступіла інфармацыя, якая адмоўна характарызуе яго. Сур'ёзнай падставай можа паслужыць і правядзенне ў сям'і работніка сацыяльнага расследавання. Акрамя таго, псіхалагічная праверка можа быць ініцыяваная ў адносінах не толькі да кандыдата на педагагічную пасаду, але і да дзеючага педагога — калі аб ім паступіць негатыўная інфармацыя.

### ХТО, ДЗЕ, КАЛІ

Сумоўе будзе праводзіцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства аб абароне персанальных даных. У пастанове Саўміна прапісана, што наймальнік прымае рашэнне аб арганізацыі і правядзенні сумоўя на працягу аднаго працоўнага дня з моманту ўзнікнення адпаведных абставін. Ацэньваць яго вынікі будуць кваліфікаваныя псіхологі.

— Установу, з якой прызначаецца псіхолаг для сумоўя, вызначаюць органы мясцовай улады, — сказала Кацярына Пятруцкая. — У кожным раёне, горадзе будуць вызначаны арганізацыі, у штаце якіх ёсць псіхологі, педагогі-псіхологі. Мяркуецца, што гэта могуць быць сацыяльна-педагагічныя цэнтры, тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання, арганізацыі аховы здароўя.

Намеснік міністра падкрэсліла, што сумоўе будзе праводзіцца ў электроннай форме: удзельніку прапануюць запоўніць анкету, якая пасля будзе апрацаваная спецыялістамі.

— Цяпер сумесна з Міністэрствам аховы здароўя мы прапрацоўваем метадычныя ўказанні, як гэта працэдура будзе ажыццяўляцца, — дадала яна. — Вынікі псіхалагічнага апытання з'яўляюцца канфідэнцыяльнымі, а доступ да іх будзе мець толькі кіраўнік установы адукацыі.

Захоўваць заключэнне аб сумоўі будуць на працягу года для кандыдата на пасаду педагога, для работніка ўстановы адукацыі — увесь час педагагічнай дзейнасці, у выпадку яго звальнення — таксама на працягу года. Намеснік кіраўніка адукацыйнага ведамства ўдакладніла, што працэдура сумоўя носіць рэкамендацыйны характар.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие **«Витебский областной центр маркетинга»** извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Ч.002.00299** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** Открытое акционерное общество **«Витебскоблавтотранс»,**
210038, г. Витебск, ул. Софьи Панковой, д. 1 ,
тел.: +375 (212) 22 80 44, факс: +375 (212) 22 80 52.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга»,
г. Витебск, проезд Гоголя, 5,
тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63,
e-mail: info@marketvit.by, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов:**
**30.12.2025 в 09.00**
(по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 200/С-49353 площадью 1087,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ш. Бешенковичское, 12, наименование – административно-бытовой корпус, назначение – здание административно-хозяйственное, составные части и принадлежности: проезжая часть: участок 1, участок 2, площадка, пешеходная часть, ограждение: участок 1, участок 2, участок 3, участок 4, участок 5, участок 6, трое ворот, калитка, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000003000131, площадью 4,8598 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ш. Бешенковичское, 12 (право постоянного пользования, доля 1/1), назначение зем. участка – земельный участок для строительства и обслуживания производственной базы.

Обременение: договоры аренды от 29.11.2024 № 52/24-А сроком по 30.11.2025, от 03.06.2025 № 32/25-А сроком по 03.09.2025.

Кап. строение с инв. № 200/С-48768 площадью 42,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ш. Бешенковичское, 12/2, наименование – АЗС на 100 заправок в сутки, назначение – здание специализированное для ремонта и (или) технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные, зарядные и газонаполнительные станции), составные части и принадлежности: участок канализационной ливневой сети, выпуск канализационный бытовой сети, ввод водопроводной сети, участок тепловой сети, сеть электропередачи, сеть наружного освещения, технологический трубопровод, очистные сооружения, резервуар РГС-60, резервуар РГС-5, резервуар РГС-25, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000003000131, площадью 4,8598 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ш. Бешенковичское, 12 (право постоянного пользования, доля 1/1), назначение зем. участка – земельный участок для строительства и обслуживания производственной базы.

Кап. строение с инв. № 200/С-77494 площадью 347,6 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ш. Бешенковичское, 12/3, наименование – здание котельной, назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности: навес, линия электропередачи, труба дымовая металлическая, труба дымовая, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000003000131, площадью 4,8598 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ш. Бешенковичское, 12 (право постоянного пользования, доля 1/1), назначение зем. участка – земельный участок для строительства и обслуживания производственной базы.

Кап. строение с инв. № 200/С-48767 площадью 1658,4 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ш. Бешенковичское, 12/1, наименование – производственный корпус, назначение – здание специализированное иного назначения, составные части и принадлежности: линия электропередачи, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000003000131, площадью 4,8598 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ш. Бешенковичское, 12 (право постоянного пользования, доля 1/1), назначение зем. участка – земельный участок для строительства и обслуживания производственной базы.

Обременение: договоры аренды от 03.06.2025 № 33/25-А сроком по 03.09.2025, от 07.05.2025 № 29/25-А сроком по 31.05.2028.

Кап. строение с инв. № 200/С-86003 протяженностью 76,2 м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, Бешенковичское шоссе, хозбытовая канализационная сеть от зданий № 12, № 12/1, № 12/2, № 12/3, наименование – хозбытовая канализационная сеть, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности: трубопровод безнапорный, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000003008228 (присвоен предварительно).

Кап. строение с инв. № 200/С-86007 протяженностью 87,3 м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, Бешенковичское шоссе, тепловая сеть от здания № 12/3, наименование – тепловая сеть, назначение – сооружение специализированное энергетики, составные части и принадлежности: трубопровод тепловой сети, дренажный трубопровод, трубопровод сети горячего водоснабжения, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000003000131, площадью 4,8598 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ш. Бешенковичское, 12 (право постоянного пользования, доля 1/1), назначение зем. участка – земельный участок для строительства и обслуживания производственной базы.

Кап. строение с инв. № 200/С-86658 площадью 22,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ш. Бешенковичское, 12/7, наименование – навес, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000003000131, площадью 4,8598 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ш. Бешенковичское, 12 (право постоянного пользования, доля 1/1), назначение зем. участка – земельный участок для строительства и обслуживания производственной базы.

Кап. строение с инв. № 200/С-86004 протяженностью 1077,2 м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, Бешенковичское шоссе, ливневая канализационная сеть от зданий № 12, № 12/1, № 12/2, № 12/3, наименование – ливневая канализационная сеть, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности: трубопровод безнапорный, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000003008227 (присвоен предварительно).

Кап. строение с инв. № 200/С-86005 протяженностью 188,3 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, Бешенковичское шоссе, газопровод среднего давления к зданию № 12/3, наименование – газопровод среднего давления, назначение – сооружение специализированное энергетики, составные части и принадлежности: трубопровод, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000003000131, площадью 4,8598 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ш. Бешенковичское, 12 (право постоянного пользования, доля 1/1), назначение зем. участка – земельный участок для строительства и обслуживания производственной базы.

Кап. строение с инв. № 200/С-86002 протяженностью 521,1 м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, Бешенковичское шоссе, водопроводная сеть к зданиям № 12, № 12/1, № 12/3, наименование – водопроводная сеть, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, составные части и принадлежности: трубопровод напорный, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000003008229 (присвоен предварительно).

Кап. строение с инв. № 200/С-49351 площадью 825,9 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, Бешенковичское шоссе, 12/5, наименование – ангар-склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: линия электропередачи, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000003000131, площадью 4,8598 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ш. Бешенковичское, 12 (право постоянного пользования, доля 1/1), назначение зем. участка – земельный участок для строительства и обслуживания производственной базы.

Обременение: договор аренды от 22.11.2024 № 51/24-А сроком по 30.11.2025, от 24.04.2024 № 18/24-А сроком по 30.04.2026.

Кап. строение с инв. № 200/С-86246 площадью 17,9 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, Бешенковичское шоссе, 12/6, наименование – здание проходной, назначение – здание специализированное иного назначения, составные части и принадлежности: линия электропередачи, линия освещения, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 240100000003000131, площадью 4,8598 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ш. Бешенковичское, 12 (право постоянного пользования, доля 1/1), назначение зем. участка – земельный участок для строительства и обслуживания производственной базы.

Эстакада б/у с инв. № АП000000000630/1.

**Нач. цена: 2 608 670,94 бел. руб. без учета НДС.**
**Задаток: 260 867,09 бел. руб.**

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: **https://etpvit.by,** внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 29.12.2025.**

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов**: в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения эл. торгов и утверждения протокола эл. торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки в сумме 5239,08 бел. руб. в т. ч. НДС 20 %, и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов не позднее 11 (одиннадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета эл. торгов.

С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: **https://etpvit.by,** в разделе: недвижимое имущество – административные здания и помещения. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел. **+375298155145.**

Извещения о проведении электронных торгов опубликованы на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу **https://au.nca.by** (№ 35329), Витебского областного исполнительного комитета **https://vitebsk-region.gov.by.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ООО «Величковичи-АГРО», Минская обл., Солигорский р-н, Копацевичский с/с, аг. Величковичи, ул. Ленина, д. 16. УНП 693179004 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

**Легковой автомобиль хэтчбек (HATCHBACK) SKODA OCTAVIA, 2016 г. в., рег. знак 4228 МЕ-5, XW8AD6NE3HH009647.**

Адрес: Солигорский р-н, Копацевичский с/с, аг. Величковичи, ул. Ленина, д. 16

**Начальная цена с НДС 20 % – 42 000,00 руб.**

Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **10 (десяти)** рабочих дней после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 6 % от цены продажи в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения торгов. Подробная информация о проведении торгов размещена на сайте www.ipmtorgi.by

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 12.01.2026.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 09.01.2026 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

11 снежня 2025 года

*Адукацыя*

# «РАЗУМЕРЫ» — ІНВЕСТЫЦЫЯ

## У Беларусі створаны першы фінансавы студэнцкі атрад

Ініцыятарам выступіў Банк развіцця, ідэю падтрымалі Міністэрства адукацыі і Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Вынікам прыняцця сумеснага рашэння стала падпісанне трыма бакамі двух пагадненняў: першым створаны студэнцкі фінатрад, другім — запушчаны праект па падтрымцы маладых навукоўцаў (выкладчыкаў).

— Мы нездарма далі такую назву першаму фінансаваму студатраду, — сказаў **старшыня праўлення Банка развіцця Сяргей СТАЛЯРЧУК**. — З аднаго боку, гэта пра цяперашнюю моладзь, якая вырасла ў эпоху лічбавых тэхналогій, інтэрнэту і сацыяльных сетак, з другога — пра мэтанакіраваных і матываваных юнакоў і дзяўчат, якія свае навыкі, веды імкнуцца накіраваць не толькі на асабістае развіццё, але і на развіццё сваёй краіны. Для нас цікавая іх энергія, уцягнутасць, матывацыя, гэта прыток новых ідэй і рашэнняў, незашораны погляд на тыя ці іншыя працэсы. А ёсць і такое, што часам устояныя рашэнні ўжо не адпавядаюць сучасным патрабаванням. Таму мы будзем імкнуцца ўкараняць новыя рашэнні і ідэі, якія прапануе моладзь.

**Міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ** падкрэсліў, што стаць членам каманды Банка развіцця — гэта выключная магчымасць для маладых людзей праявіць сябе ва ўнікальнай арганізацыі, якая істотным чынам адрозніваецца ад усіх банкаў нашай краіны.

— На вас ляжыць і велізарная адказнасць, — сказаў, звяртаючыся да членаў атрада, кіраўнік ведамства. — Ад таго, як сябе праявіце,



ИЗМЕНЕНИЯ
в проектную декларацию
ООО «Датч Стар»,
*опубликованной в газете «Звязда» 07.05.2024 г.*

**по объекту**
«Жилая застройка со встроенными помещениями общественного назначения в границах пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Папанина»
(3-я очередь строительства)

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 3 (1-й пусковой комплекс) предлагаются:

**2 (две)** однокомнатные квартиры **площадью от 54 до 55 кв. м**, стоимость 1 кв. метра **от 5 810 до 6 000 белорусских рублей;**

**7 (семь)** двухкомнатных квартир **площадью от 98 до 101 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 4 544 до 5 500 белорусских рублей.**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 4 (2-й пусковой комплекс) предлагаются:

**2 (две)** однокомнатные квартиры **площадью от 54 до 55 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 810 до 6 000 белорусских рублей;**

**5 (пять)** двухкомнатных квартир **площадью от 67 до 130 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 4 155 до 5 500 белорусских рублей.**

**Условия оплаты квартир** – полная оплата цены договора в течение 3-7 банковских дней с момента регистрации договора долевого строительства в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома.

Ознакомиться с планировками квартир можно по предварительной записи в офисе продаж ЖК «Гранд Авеню» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567, тел. +375 17 336-73-88, по графику пн.–пт. с 9.00 до 18.00, сб. с 10.00 до 16.00, вс. – выходной либо на сайте grandavenue.by.

Прием заявлений на заключение договоров создания объектов долевого строительства будет осуществляться в офисе продаж ЖК «Гранд Авеню» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567 с 9.00 рабочего дня, следующего за днем опубликования настоящего изменения в декларацию в порядке живой очереди.

УНП 191061436

# СПРАВА, ДА ЯКОЙ ЛЯЖЫЦЬ ДУША

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Сёлета да нас прыйшлі шаснаццаць маладых спецыялістаў: чатыры ўрачы і дванаццаць спецыялістаў з сярэдняй медыцынскай адукацыяй, — расказала **галоўны ўрач Валожынскай цэнтральнай раённай бальніцы Ганна ШУРЫГІНА**. — За ўсімі замацаваны куратар — спецыяліст першай кваліфікацыйнай катэгорыі, чалавек з вялікім досведам. Ён не толькі ўводзіць пачаткоўцаў у справу і дапамагае ўліцца ў калектыў, але і садзейнічае ў вырашэнні іншых, не менш важных пытанняў. Да куратара нашы маладыя ўрачы і спецыялісты могуць звярнуцца па дапамогу заўсёды, але ж і да астатніх таксама. Звычайна перыяд адаптацыі складае паўгода, па неабходнасці яго можна і падоўжыць. Мы зацікаўлены, каб моладзі было камфортна працаваць.

Для гэтага створаны ўсе ўмовы: даём месца ў інтэрнаце, ёсць магчымасць атрымаць арэнднае жыллё. Калі моладзь выбірае самастойна здымаць кватэру, ім дадаткова выплачваецца сума ў памеры трох базавых велічынь. Плюс абавязковыя даплаты.

Тыя веды, якія нельга набыць у каледжы або ва ўніверсітэце, дзяўчаты і хлопцы набываюць на працы, падзялілася Ганна Валер'еўна:

— Усё прыходзіць з вопытам! Нельга ў тэорыі навучыць узаемадзейнічаць з пацыентамі — толькі на практыцы. Людзі бываюць розныя, хтосьці — сумныя, хтосьці — заклапочаны. Наша задача — дакладна аказаць дапамогу, зрабіць усё магчымае. І, безумоўна, варта да кожнага шукаць індывідуальны падыход.

Пры гэтым, заўважыла галоўны ўрач, яго імкнуцца знайсці ў адносінах не толькі да пацыента, але і да маладога спецыяліста.

— Заўсёды вучым: трэба размаўляць адзін з адным. Нашы дасведчаныя калегі даволі строгія. Але здароўе памылак не даруе. Трэба тлумачыць і працаваць на апярэджанне, каб не было праблем.

Сама Ганна Валер'еўна родам з Брэсцкай вобласці, скончыла педыятрычны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

— Доўгі час я працавала неанатолагам. Цяпер — галоўны ўрач. У сям'і нікога са сферы аховы здароўя не было, а ў мяне да гэтай справы ляжала душа. Праца — маё «дзіця». Я тут праводжу вельмі шмат часу. Што датычыцца маладых спецыялістаў, з імі шмат узаемадзейнічаю. Некаторыя прыязджаюць сюды ў першы дзень з бацькамі — тыя перажываюць, ці будзе тут камфортна працаваць. Паверце, будзе! Настаўніцтва — не толькі пра працу, насамрэч, але і пра звычайнае жыццё. Мы заўсёды побач!

**Уладзіслаў ШАКУН, урач-рэнтгенолаг**, вучыўся на бюджэце ў Гомельскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. Родам малады чалавек з Мар'інай Горкі.



— Размеркаванне ў раённую бальніцу для маладога спецыяліста — скарбніца досведу, — гаворыць малады ўрач. — Метад ацэнкі ў маёй працы — візуальна-суб'ектыўны, шмат вырашае назіральнасць. Чым больш варыяцый якой-небудзь паталогіі ты ўбачыў, тым больш кампетэнтны стаў. Здымкі рэдка трапляюцца аднолькавыя, таму мая праца прадугледжвае бесперапынны прафесійны рост.

17.12.2025 г. в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня
1) О выплате вознаграждения.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Белорусская, 51.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Белорусская, 51.
Время регистрации в день проведения собрания с 10.30 до 11.00.
Для регистрации необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
Дата сбора реестра акционеров – 11.12.2025 г.
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 11.12.2025 г. (с 14.00 до 15.00) по местонахождению общества.

Наблюдательный совет.

УНП 200050191

# Ў БУДУЧЫНЮ



залежыць далейшае развіццё гэтага праекта.

Каманда першага фінансавага атрада — гэта 11 студэнтаў сталічных ВНУ, якіх адабралі на конкурснай аснове. Па словах **начальніка ўпраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Таццяны СІМАНОЎСКАЙ**, усяго было пададзена 36 заявак ад універсітэтаў, дзе навучаюць у тым ліку і па эканамічных спецыяльнасцях. Конкурс сур'ёзны, у выніку толькі трэць маладых людзей трапілі ў атрад. Адзін са шчаслівучыкаў — студэнт трэцяга курса Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, які навучаецца па спецыяльнасці «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі», — Данііл Дзенісенка.

— Я рады трапіць у праект, ён вельмі цікавы і дасць важны практычны вопыт, а таксама разуменне таго, чым ты хочаш займацца ў будучыні, — сказаў юнак. — І гэта выдатная магчымасць паспрабаваць сябе ў рэальным сектары эканомікі, прымяніць свае веды на практыцы, а не вырашаць задачы ў тэорыі.

Мэтай праекта сапраўды з'яўляецца практычная падрыхтоўка будучых спецыялістаў для работы ў рэальным сектары эканомікі: прамысловасці, сельскай гаспадарцы, энергетыцы, IT і іншых галінах. На працягу года студэнты стануць паўнавартаснымі супрацоўнікамі чатырох структурных падраздзяленняў Банка развіцця — упраўлення рызыка-менеджменту, праектнага цэнтра, цэнтра аналізу і стратэгічнага планавання і цэнтра арганізацыйных змяненняў і інфармацыйных тэхналогій. Там ім трэба будзе вырашаць рэальныя задачы і прапаноўваць новыя рашэнні. Далейшы шмат у чым залежыць ад іх саміх — калі праявяць сябе як прафесіяналы, знойдуць сваё месца ў калектыве, то пасля заканчэння ВНУ Банк развіцця можа стаць іх першым рабочым месцам.

Практычная накіраванасць праекта па маладых навукоўцах прадугледжвае сувязь навукі і бізнесу. Задача яго таксама практыка-арыентаваная — далучыць маладых выкладчыкаў да патрэб рэальнага сектара эканомікі. Атрыманы вопыт яны змогуць трансфармаваць у адукацыйны працэс, навучаючы студэнтаў на аснове актуальных кейсаў і сучасных падыходаў.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота БелТА.**







Адказнасць за здароўе, прызнаўся малады чалавек, асабліва адчуваецца, паколькі за табой прыняцце рашэння, пастаноўка дыягназу:

— За мной ніхто не перапраўляе. Перш чым аддаць пацыенту заключэнне, пераконваюся не адзін раз, што я ўсе моманты ўлічыў і ўсё зрабіў правільна. Калі пачаў працаваць самастойна, я адчуў пэўнае задавальненне. Думаў, з часам яно знікне. Але мне ўсё яшчэ цікава. Бывае, безумоўна, цяжкавата, даследаванняў шмат, але з усім спраўляюся.

**Вера СІЛЬВЯСЮК** працуе медыцынскай сястрой у хірургічным аддзяленні. Дзяўчына прызнаецца: на яе плячах — вялікая адказнасць.

— Я з раніцы хаджу на абходы з урачамі, пазначаю ўсе іх рэкамендацыі, неабходнасць правядзення пацыенту пэўных працэдур, напрыклад камп'ютарнай тамаграфіі. А на працягу дня каардыную работу, адводжу пацыентаў, куды неабходна. Спачатку працаваць з людзьмі было складана. У мяне мама — ветэрынар. Яна, падтрымліваючы, казала так: «Я з такім таксама сутыкалася». І сапраўды, цяпер адчуваю сябе значна больш упэўнена. Я была гатова да адказнасці, разумела заўсёды, што гаворка ідзе пра жыццё чалавека. Пацыенты бываюць розныя. Некаторыя пытаюцца, калі ў мяне наступная працоўная змена, чакаюць, калі да іх прыйду. Гэта, безумоўна, прыемна.

Дзяўчына расказала пра хвалюючы выпадак, які здарыўся з ёй, калі толькі прыступіла да работы.

— Позна ўвечары паступіла жанчына, у якой быў вострый апендыцыт. Я, вядома, ведала, што трэба рабіць, але крыху разгубілася. Паклікала дапамагчы медсястру, з якой разам з усім справіліся. Цяпер да працы ўжо прывыкла, але гэты выпадак запомню надоўга!

**Павел САВІЦКІ** працуе памочнікам урача. У яго абавязкі ўваходзіць правядзенне дыспансерызацыі.

— Мая мама працуе медыцынскай сястрой у неўралагічным аддзяленні Валожынскай ЦРБ, аднак бацькі ніякага ціску ў выбары прафесіі не аказвалі. Медыцына павінна падабацца. Што датычыцца працы, якой я цяпер займаюся, гэта цікава і хвалююча адначасова. Дыспансерызацыя накіравана на выяўленне захворванняў на ранняй стадыі, таму я вельмі адказна падыходжу да справы, уважліва слухаю кожнага пацыента. І ўсім рэкамендую, дарэчы, здаваць аналізы і клапаціцца аб сваім здароўі своечасова!

Малады чалавек у будучыні бачыць сябе ў выкладчыцкай дзейнасці, асабліва яго цікавяць анатомія і фізіялогія. Павел сёлета паступіў на завочнае аддзяленне ў Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А.Д. Сахарава Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

— Работа ў сферы аховы здароўя складаная, але вельмі цікавая. З гэтага шляху сыходзіць не збіраюся. Вы не ўяўляеце, як прыемна пачуць ад пацыента ці яго сваякоў цёплыя словы падзякі за аказаную дапамогу.

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**


## О реализации имущества ООО «ГАРАНТ КАЧЕСТВА

| Организатор торгов | ООО «ЛиквидБай», УНП 192290290 |
|---|---|
| Продавец | ООО «ГАРАНТ КАЧЕСТВА», УНП 190530832 |
| Форма, дата, время и место проведения торгов | Повторные торги в форме открытого аукциона **30.12.2025 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, оф. 301 |
| **Сведения о предмете проведения торгов** | |
| **Лот № 1 – стройматериалы (109 наименований). Лот № 2 – строительное оборудование (142 наименований).** Перечень имущества размещен на сайте организатора (https://likvid.by). По вопросу ознакомления с предметом торгов, дополнительной информации обращаться по тел.: +37529 6244330, +37544 7945248 | |
| **Начальная цена предмета торгов:** Лот № 1: **27 904,24** руб. с НДС; Лот № 2: **18 917,98** руб. с НДС | |
| **Порядок проведения торгов** | |
| Шаг аукциона – 5 %. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявки на участие в них только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 % | |
| **Размер задатка, сроки приема заявок и порядок зачисления задатка** | |
| Задаток в сумме 10 % от стоимости предмета торгов перечисляется по лоту в срок по **29.12.2025** на р/с BY78BPSB30121732950169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, код BPSBBY2X, получатель – ООО «ЛиквидБай», УНП 192290290, назначение платежа – задаток за участие в аукционе. Задаток должен быть внесен до подачи заявки на участие в торгах. Прием заявок с приложением документов осуществляется заказной корреспонденцией в адрес ООО «ЛиквидБай» (220079, г. Минск, а/я 256) либо по e-mail: info@likvid.by – до 18.00 29.12.2025 | |
| Возмещение затрат | Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня проведения |
| Документы, необходимые для участия в торгах | Заявка на участие в торгах, платежный документ о перечислении задатка; документ, подтверждающий полномочия на участие в торгах |

## Извещение о проведении повторных торгов, в форме открытого конкурса

*(первоначальное извещении о проведении торгов, было размещено в газете «Звязда» № 213 (30601) от 04 ноября 2025 г.)*

1. Дата, время проведения повторных торгов – **22.12.2025 г., в 11.00.**
2. Предмет торгов:

**право на заключение договора купли-продажи ОДНОКОМНАТНОЙ КВАРТИРЫ с инв. № 500/D-7988246408, расположенной по адресу: г. Минск, ул. Жореса Алфёрова, д. 1, кв. 84.**

3. Начальная цена (сумма в белорусских рублях, эквивалентная) – 62500 долларов США по курсу НБ РБ на день проведения торгов.
4. Общая площадь квартиры – 25,6 кв. м.
5. Конкурсное обеспечение/конкурсный сбор – 1513,23/2017,64 белорусских рублей.
6. Срок передачи объекта/срок снятия с регистрационного учёта – до сделки.
7. Дата, время начала приёма заявок/дата, время окончания приёма заявок – 11.12.2025 г. в 11.00/22.12.2025 г. в 11.00.
8. Срок возможного отказа от проведения торгов – 22.12.2025 г. в 11.00.
9. Срок заключения договора купли-продажи объекта после проведения торгов (в рабочих днях) – не более 20.
10. Форма и сроки расчета за объект (в календарных днях) с момента заключения договора купли-продажи – наличные в день заключения договора и/или использование кредитных средств.
11. Иные условия проведения торгов: Победитель торгов определяется в соответствии с Правилами организации и проведения торгов, в форме конкурса ООО «Центростиль Эстейт», утвержденными приказом директора от 25.08.2025 г. № 6 (далее – Правила). К участию в торгах допускаются лица (далее – Участники), внесшие конкурсное обеспечение, подавшие заявки на участие в торгах и предложения. Проведение торгов, подача заявок на участие в торгах, предложений происходит по адресу: г. Минск, ул. Орловская, д. 40А, комн. 11/13.

Для участия в торгах, Участники представляют Организатору документ об уплате конкурсного обеспечения, а также документы согласно п.п. 4.2.–4.6. Правил. Конкурсный сбор, в порядке возмещения затрат на организацию и проведение торгов, в форме конкурса оплачивается Победителем торгов (единственным Участником) в день подписания протокола торгов. Конкурсное обеспечение, конкурсный сбор перечисляется на р/с BY95ALFA30122H65370010270000 в ЗАО «АЛЬФА БАНК» г. Минск, БИК банка: ALFABY2X или в кассу Организатора, по адресу: г. Минск, ул. Орловская, д. 40А, комн. 11/13. Организатор ООО «Центростиль Эстейт» г. Минск, ул. Орловская, д. 40А, комн. 11/13. Тел. +375296772048.

УНП 193883152

18.12.2025 г. в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Белорусская, 51.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Белорусская, 51.

Время регистрации в день проведения собрания с 10.30 до 11.00.

Для регистрации необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

Дата сбора реестра акционеров – 11.12.2025 г.

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 11.12.2025 г. (с 14.00 до 15.00) по местонахождению общества.

Наблюдательный совет.

УНП 200050191

В связи с утерей **считать недействительными** бланки страховых свидетельств ф-ла СООО «Асоба» в г. Минске по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев ТС на территории РБ серии: ТА6808081, ТА6753323-6753325, ТА5733522, ТА5735515, МА9370352-9370370; страховых полюсов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (форма 2РН, 2РП) серии БК0516241-0516245, БК04744491-0474500, БК0360182, БК0360185-0360186, (форма 2 РП) серии БМ1461945-1461955, БМ1508095, БМ1449759-1449770, БМ1514059, БМ1435983-1436000; квитанции о приеме д/средств (страховых взносов) Ф 1-СУ серии ВВ 2393703, ВВ0798101-0798110, СВ2385078-2385080, ВВ2370124, в количестве 101 штуки.

УНП 100706519

# КАЛІ Ў ВЕРАСНІ — ЯШЧЭ ЛЕТА...

## Распрацоўваюцца розныя кліматычныя сцэнарыі надвор'я

У найбліжэйшы час у краіне плануецца стварыць інтэрактыўную геаінфармацыйную сістэму доўгатэрміновага прагназавання клімату для падтрымкі надвор'езалежных галін. Аб гэтым паведаміла начальнік аддзела вывучэння змяненняў клімату службы метэаралагічнага і кліматычнага маніторынгу фонду даных Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Вольга БАКЛАНАВА. На працягу трох гадоў Белгідрамет сумесна з Інстытутам прыродакарыстання НАН Беларусі спрагназуе некалькі сцэнарыяў у залежнасці ад розных паказчыкаў канцэнтрацыі вуглякіслага газу, а таксама складзе прагнозы для ўсіх 118 раённых цэнтраў краіны.



**Як зазначыла спецыяліст, за апошнія 10 гадоў назіраюцца дадатныя адхіленні сярэдняй тэмпературы паветра ад кліматычнай нормы. Увосень яны вагаюцца ад 1,1 да 2,7 градуса. Сярэдняя тэмпература гэтай восенню склала +8,6 °С. За пасляваенны перыяд такая цёплая восень зафіксавана ўжо шосты раз, прычым пяць з іх прыпалі на апошняе дзесяцігоддзе. Самы цёплы восеньскі сезон быў у 2020 годзе з сярэдняй тэмпературай 9,7 °С. А самы халодны — у 1993-м (+3,2 °С).**

Як паказваюць назіранні, верасень усё больш падобны на летні месяц і характарызуецца ўстойлівым цёплым надвор'ем. Паводле слоў **начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Белгідрамета Марыны ГРЫЦКЕВІЧ**, такія змены звязаны з агульнымі кліматычнымі тэндэнцыямі, у прыватнасці з павышэннем сярэдняй глабальнай тэмпературы паветра на планеце. У выніку мяняецца працягласць пор года. У сувязі з высокімі тэмпературамі ў паўднёва-заходніх рэгіёнах краіны ў верасні нават аб'яўляўся аранжавы ўзровень небяспекі.

Усяго за восень было падрыхтавана і выпушчана 23 папярэджанні аб розных неспрыяльных з'явах. **Начальнік службы гідралогіі і аграметэаралогіі Белгідрамета Кацярына ІСТОМІНА** ў сваю чаргу адзначыла, што сёлета на тэрыторыі краіны склаліся складаныя ўмовы для вырошчвання сельскагаспадарчых культур. Мелі месца неспрыяльныя і небяспечныя метэаралагічныя з'явы — замаразкі і моцныя дажджы. Так, веснавыя замаразкі прывялі да значных страт пладова-ягадных культур, у некаторых гаспадарках яны дасягнулі 100 %. У той жа час атрыманы добры ўраджай збожжавых, бабовых культур, цукровых буракоў і льновалакна.

Калі казаць пра будучы ўраджай, то да пачатку зімоўкі ўмовы для сельскагаспадарчых культур на палях здавальняючыя: глеба талая, вільгаці дастаткова, снежнага покрыва пакуль няма. Але шмат будзе залежаць ад надвор'я ў зімовы перыяд. Разумеючы рызыку і ўплыў фактараў надвор'я на развіццё сельскай гаспадаркі, у мэтах забеспячэння харчовай бяспекі краіны Белгідраметам сумесна з Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання распрацавана і рэалізуецца стратэгія адаптацыі сельскай гаспадаркі да змянення клімату.

Пры гэтым варта адзначыць, што змены маюць не толькі негатыўны, але і пазітыўны ўплыў. Змяняецца набор сельскагаспадарчых культур для вырошчвання, з'яўляюцца новыя — больш цеплалюбівыя. Павялічваюцца плошчы азімага ячменю. Безумоўна, негатыўным фактарам застаюцца рэзкія перапады тэмператур, калі перыяды моцных халадоў рэзка змяняюцца адлігамі з недастатковасцю снежнага покрыва. Пошук і ўкараненне новых культур, удасканаленне метадаў вядзення сельскай гаспадаркі з улікам кліматычных змен дазваляюць падтрымліваць стабільнасць і гарантаваць харчовую бяспеку краіны.

**Сяргей САКАЛОЎ.**

## Извещение о проведении 24 декабря 2025 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

| Сведения о продаваемом имуществе (предмете торгов) | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, с учётом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| 1 | Капитальное строение с инв. номером 420/С-33082 общей площадью 1066,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Коммунистическая, д. 38А, наименование – магазин № 43, назначение – здание специализированное розничной торговли; капитальное строение с инв. номером 420/С-33277* общей площадью 138,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Коммунистическая, д.38, наименование – магазин № 51, назначение – здание специализированное розничной торговли; капитальное строение с инв. номером 420/С-5931 общей площадью 92,7 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Докучаева, 4, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инв. номером 420/С-46997 общей площадью 164,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Докучаева, д. 2, наименование – магазин № 52, назначение – здание специализированное розничной торговли.<br>* Обременение: аренда по 07.09.2026 | Площадь – 0,3387 га, кадастровый номер – 441300000010000096 | 400 721,47 | 40 000,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. номером 633/С-10565 общей площадью 66,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Будславский с/с, п. Будслав, наименование – магазин № 50, назначение – здание специализированное розничной торговли | Площадь – 0,0395 га, кадастровый номер – 624080602101000023 | 3 408,00 | 340,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. номером 633/С-10564 общей площадью 64,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Княгининский с/с, аг. Княгинин, ул. Привокзальная, д. 81, наименование – магазин № 42, назначение – здание специализированное розничной торговли; отопительный котел «Тисом» с инв. номером по бух. учёту 080840 | Площадь – 0,0379 га, кадастровый номер – 624082004601000184 | 4 222,00 | 420,00 |
| 4 | Капитальное строение с инв. номером 240/С-45976 общей площадью 115,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2, наименование – здание магазина № 61, назначение – здание специализированное розничной торговли; капитальное строение** с инв. номером по бух. учёту 084792 общей площадью 22,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2/1, наименование – здание склада | Площадь – 0,0370 га, кадастровый номер – 223684400001000005 | Одна базовая величина | Одна базовая величина |
| *** Согласно пункту 2 положения о порядке распоряжения неиспользуемым имуществом хозяйственных обществ, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.09.2022 № 330 «О распоряжении имуществом», продажа неиспользуемого имущества на торгах (на аукционе или по конкурсу) либо без проведения торгов может осуществляться в том числе без наличия документов, удостоверяющих государственную регистрацию его создания, возникновения прав, ограничений (обременений) прав на него* | | Продаваемое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, техническим характеристикам и комплектации. Рекомендуется проведение осмотра. | | |

**Продавец имущества:** ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:** победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков), документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах 24.12.2025 по предмету торгов №__.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **24 декабря 2025 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 12.12.2025 по 22.12.2025** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (017) 240-62-06.

**Телефоны для справок:** (017) 360-42-22, 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06; (017) 240-61-88 (ОАО «ДОРОРС»).

Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

# АРНАМЕНТ ГУЧЫЦЬ!

## Тэкстыльная школа сусветнага ўзроўню знаходзіцца ў Веткаўскім раёне

**Неглюбская тэкстыльная традыцыя Веткаўскага раёна, уключаная ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, патрабуе неадкладнай аховы. Такое рашэнне 9 снежня прыняў Міжурадавы камітэт ЮНЕСКА на сесіі ў Нью-Дэлі. Гэты крок падкрэсліў значнасць рамяства, якое з'явілася ў Неглюбцы каля чатырох стагоддзяў таму і захавала сувязь з раннімі пластамі народнай культуры.**

Неглюбская тэкстыльная традыцыя Веткаўскага раёна, што ўзнікла ў XVII стагоддзі, уключае стварэнне ручнікоў, адзення і рэчаў для інтэр'еру. Уменні пераходзілі ад маці да дачкі за хатнімі кроснамі, праз жывое навучанне і штодзённую працу.

Асаблівую вядомасць набылі неглюбскія ручнікі. Іх унікальная адметнасць — шматкаляровая палітра. Так, у адным вырабе можа быць да дваццаці пяці адценняў. Арнаментальная спадчына налічвае больш за сто дваццаць узораў: «крывулі», «павукі», «яблынька» і іншыя матывы, у якіх захаваліся старажытныя ўяўленні і пажаданні дабрабыту. Асаблівая ткацкая методыка — работа вываратнага боку, якая робіць кожны неглюбскі ручнік непаўторным. Яны ствараюцца з выкарыстаннем бранага, пераборнага, выбарнага, закладнога і шматнітавага ткацтва. Важнае месца займае «неглюбская мярэжка» і разнастайныя віды тэкстыльнага пляцення. Кампазіцыя ручнікоў захоўвае сіметрыю: на кожным канцы ад трох да дзевяці арнаментальных палос. Канцы ўпрыгожваюцца махрой з пятляў з белых, чырвоных і чорных нітак. Мясцовыя майстрыхі таксама ткуць шматколерныя посцілкі, настольнікі, фіранкі і накутнікі — вырабы, якія захоўваюць высокі мастацкі ўзровень неглюбскай школы.

Як заўважае **загадчык сектара культуры Веткаўскага райвыканкама Дар'я ШАЛАБОДАВА,** неглюбская тэкстыльная традыцыя застаецца жывой і не страчвае сувязі з жыццём вёскі.

— Жыхаркі Неглюбкі працягваюць ткаць для сваіх сем'яў, абрадаў і хатняга ўжытку, таму пераемнасць не перарываецца. У Неглюбскім сельскім цэнтры ткацтва дзеці і падлеткі атрымліваюць першыя навыкі працы з ніткай і ўзорным ткацтвам. Таму традыцыя захоўваецца на жывой цікавасці да рамяства і пачуцці адказнасці майстрых, якія перадаюць свой досвед маладому пакаленню, — падкрэсліла загадчык сектара культуры Веткаўскага райвыканкама.



Як зазначыла Дар'я Шалабодава, у захаванне старажытнага рамяства Веткаўшчыны ўнеслі



істотны ўклад як неглюбскія ткачыхі, так і навуковыя супрацоўнікі Веткаўскага музея стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава, дзе створаны найбагацейшы экспазіцыйны зал, прысвечаны мясцовай тэкстыльнай традыцыі і неглюбскім ручнікам. Акрамя таго, супрацоўнікі музея выязджаюць у даследчыцкія экспедыцыі і дагэтуль працягваюць збіраць элементы неглюбскага строю. У фондах музея захоўваюцца неглюбскія ручнікі, вытканыя яшчэ ў канцы XIX стагоддзя.

Неглюбская тэкстыльная традыцыя Веткаўскага раёна прадстаўлена вельмі шырока ў тым ліку дзякуючы ўвазе да гэтага культурнага феномена Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА, Міністэрства культуры, Міністэрства замежных спраў, навукоўцаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

У даследчыкаў народных традыцый асаблівую цікавасць выклікае неглюбскі народны строй — комплекс традыцыйнага адзення, што існаваў у XIX — сярэдзіне XX ст. на Веткаўшчыне і ў некаторых раёнах Бранскай вобласці. Яго архаічныя элементы — панёва, нагрудны фартух-«запіна», намітка і тканая хустка — адлюстроўваюць надзвычай шырокі набор ткацкіх прыёмаў. Тканы матэрыял мог аб'ядноўваць ніткі розных відаў і ствараць непаўторную выразную фактуру.

— Уключэнне неглюбскай тэкстыльнай традыцыі ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА — сведчанне ўвагі на сусветным узроўні да рамяства, якое складалася ў Неглюбцы з XVII стагоддзя і захавала старажытныя рысы. Для Веткаўскага раёна гэта прызнанне працы мясцовых майстрых, дзякуючы якім да нашага часу захаваліся тэхнікі ткацтва, багатая паліхромія і шматлікія арнаменты, — гаворыць Дар'я Шалабодава. — Гэта і прызнанне вялікай каштоўнасці беларускіх рэгіянальных традыцый, увагі да народнага мастацтва, якое жыве і перадаецца з пакалення ў пакаленне на Веткаўшчыне.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**


## ООО «Этерия групп» организует конкурсные торги

| Дата и время проведения | Предмет (право на заключение договоров купли-продажи) | Начальная цена (в бел. руб. эквивалентная по курсу НБ РБ на день проведения торгов) | Общая площадь | Конкурсное обеспечение в бел. руб. | Срок заключения договора купли-продажи/аренды | Расчеты за объект (в рабочих днях) момента заключения договора купли-продажи |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **21.12.2025 12.00** | Продажа квартиры с инв. № 500/D-708142039, по адресу: г. Минск, ул. Неманская, 2-1 | 199000 | 105,2 кв. м | 42 | 90 | В день |
| **21.12.2025 13.00** | Продажа квартиры с инв. № 500/D-708165009, по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 4-27 | 1050000 | 334,0 кв. м | 42 | 90 | В день |
| **21.12.2025 14.00** | Продажа квартиры с инв. № 500/D-669383, по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71/А | 115000 | 73,1 кв. м | 42 | 30 | В день |
| **11.01.2026 12.00** | Продажа квартиры с инв. № 500/D-586192, по адресу: г. Минск, ул. Бачило Алеся, 21 | 63000 | 33.4 кв. м | 42 | 90 | В день |
| **11.01.2026 13.00** | Продажа садового домика с инв. № 623/C-39771, по адресу: Минская обл., Узденский р-н, Узденский с/с, СТ «Сымончицы-1», 25 | 29000 | 57,1 кв. м | 42 | 90 | В день |
| **11.01.2026 14.00** | Продажа квартиры с инв. № 500/C-13013985, по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 126 | 125000 | 49,0 кв. м | 42 | 30 | В день |
| **11.01.2026 15.00** | Продажа квартиры с инв. № 500/D-668950, по адресу: г. Минск, ул. Брикета, 16 | 100000 | 54,0 кв. м | 42 | 90 | В день |

Торги состоятся по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, 1, пом. 1418, оф. п. 2.** Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми к нему документами принимаются **до 11.01.2026** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, пом. 1418, оф. п. 2. Победитель торгов в день проведения подписывает протокол о результатах торгов.
Иные условия проведения объявленных конкурсов: право подачи и подписания заявления о государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав предоставляется покупателю.
Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с правилами проведения конкурсов по продаже имущества ООО «Этерия групп», утвержденным приказом директора от 11.10.2025 № 7-ОД.
Организатор вправе отказаться от конкурсов (повторного конкурса) в любое время до начала торгов. Телефон для справок (+37529) 120-88-99.

УНП 193905687



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## *ОАО «Н Холдинг» проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «Брестский электроламповый завод»*

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-97463, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Московская, 204-2. Площадь: 5724,2 кв. м. Наименование: Изолированное нежилое помещение. Назначение: Административное помещение. Обременение: аренда | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т.ч. НДС 20 %), BYN** | **2 631 360,00** | **Задаток, BYN** | **263 136,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **ЛОТ № 2** | Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-19140, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Московская, 204. Площадь: 5791,9 кв. м. Наименование: Составной корпус. Назначение: Здание специализированное для производства электротехнического, электронного и (или) оптического оборудования. Обременение: аренда, ипотека. Продавец обязуется снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем.<br>Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 140100000001034650, площадью 0,6110 га, предоставленном ОАО «БЭЛЗ» на праве аренды (срок действия по 22.08.2046). Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения), площадью 0,6110 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **2 256 000,00** | **Задаток, BYN** | **225 600,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о Продавце, его местонахождение** | Открытое акционерное общество «Брестский электроламповый завод» Местонахождение: 224633, Брестская область, г. Брест, ул. Московская, д. 204 | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | Открытое акционерное общество «Н Холдинг», 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1 **Корбут Мария, +375 29 754 63 46,** e-mail: arenda@h-holding.by | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |

| | |
|---|---|
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона, обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами – в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр. Независимости, д. 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696.<br>Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **22 декабря 2025 года** включительно в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **23 декабря 2025 года** по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг»: по Лоту № 1 в 14.00; по Лоту № 2 в 15.00 |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона

НАПЯРЭДАДНІ

# БАЛЕТ НА КІНАЭКРАНЕ І СМАЧНАЯ «ПЯСОЧНІЦА»



## Чым здзіўляе пераднавагодняя сталіца

У сталічную сетку ўваходзяць 13 дзяржаўных кінатэатраў. І рыхтавацца да святочных паказаў яны пачалі загадзя да «гадзіны пік», паведаміў першы намеснік генеральнага дырэктара УП «Кінавідэапракат» Мінгарвыканкама Ігар КУЗНЯЦОЎ.

Самай галоўнай падзеяй навагодняй праграмы спікер адзначыў паказ на вялікім экране балета «Шчаўкунок». Ужо з 11 снежня ў кінатэатрах стартуе паказ расійскага фільма «Снегавік» рэжысёра Аляксандра Бабаева. Гэта гісторыя пра тое, як звычайная дзяўчынка і няпамятлівы снегавік ратуюць магію навагодняга свята ад злой Завірухі, але для гэтага ім трэба прайсці квэст па зімовай Маскве.

А 8 снежня ў пракат выйшаў расійскі серыял «Ёлкі-12». Там раскажуць гісторыю 9-гадовага Вані, які даведаўся, што яго бацькі хочуць развесціся. Хлопчык адпраўляецца ў Вялікі Усцюг да Дзеда Мароза, каб папрасіць у зімовага чараўніка захаваць яго сям'ю.

У кінатэатры «Масква» ў вялікай зале 16 снежня пачынаюць прамыя трансляцыі гульняў хакейнага клуба «Дынама». З 25 снежня тут адбудзецца прэм'ера дзіцячага мультфільма «Тры волаты і святло клінам. Волаты адпраўляюцца ратаваць Русь ад чорнай хмары, якая пагражае захапіць дзень і ператварыць яго ў ноч. А ў гэты час на княства нападае купец Калыван са злыднямі... А ў студзені гледачы змогуць убачыць фільмы «Чабурашка-2», «Праставашына» і «Бураціна».

Як паведаміла **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінскага гарвыканкама Эла ЖАЎТКО,** з 15 да 31 снежня ў Палацы мастацтваў будзе працаваць зімовая выстаўка-кірмаш. «Наведвальнікам прапануюць прадукцыю беларускіх майстроў, рамеснікаў, вырабы ручной работы. Выстава «Дабрадзел» пройдзе з 26 да 28 снежня. Яе арганізуе Свята-Елісавецінскі жаночы манастыр. Вядомы жыхарам і гасцям Мінска кірмаш «Чароўны млын». Тут можна будзе набыць навагоднія падарункі ручной работы», — звярнула ўвагу Эла Жаўтко.

З 18 да 28 снежня пачнуць працаваць стрытфуд-пляцоўкі, у тым ліку «Пясочніца» на вуліцы Куйбышава з фудтракамі, фотазонамі і забаўкамі, а з 25 снежня да 11 студзеня на праспекце Незалежнасці адкрыецца зімовая гастрапляцоўка «Найлепшая вуліца» з фудкортам і святочнай праграмай.

Кіраўнік кампаніі, якая выпускае шкляныя святочныя цацкі ручной работы, адзначыў, што кожны год яны абнаўляюць асартымент прыкладна на 30 % і ўводзяць новыя пазіцыі. Сёлета гэта сімвалы года, формавыя цацкі са шкла і полікерамікі, у тым ліку «Конь у паліто».

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Надвор'е на заўтра

| Горад | Ноччу | Днём |
|---|---|---|
| МІНСК 760 мм рт.сл. | +5..+7 °C | +5..+7 °C |
| ВІЦЕБСК 759 мм рт.сл. | +5..+6 °C | 0..+5 °C |
| МАГІЛЁЎ 759 мм рт.сл. | +5..+6 °C | +3..+7 °C |
| ГОМЕЛЬ 758 мм рт.сл. | +5..+6 °C | +5..+7 °C |
| ГРОДНА 763 мм рт.сл. | +6..+7 °C | +7..+8 °C |
| БРЭСТ 764 мм рт.сл. | +5..+7 °C | +6..+8 °C |

Паводле дадзеных Белгідрамета

...у суседзяў

МАСКВА +2..+3 °C

С.-ПЕЦЯРБУРГ -2..-1 °C

**Месяц**

*Апошняя чвэрць 11.12–19.12. Месяц у сузор'і Дзевы.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**




Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура



Фота БелТА.

# ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 241

27 верасня ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках адбыўся чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па шашках-100 па вокамгненнай гульні. У мужчынскім турніры сярод 34 удзельнікаў упэўнена перамог міжнародны майстар Аляксей Куніца — 16 ачкоў з 18 магчымых. Сярэбраны медаль у майстра Віталія Варушылы, «бронзу» заваяваў майстар Уладзіслаў Спленддэр (у абодвух па 12 ачкоў). У жанчын спаборнічала 16 шашыстак, чэмпіёнкай стала майстар Яўгенія Швед — 15 ачкоў. Другое месца ў майстра Марыі Таранінай, на трэцім месцы фінішавала майстар Анастасія Сакалова (у абедзвюх па 13 ачкоў).

З 13 да 16 кастрычніка ў Гомелі пры падтрымцы Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь праходзілі міжнародныя камандныя спаборніцтвы па шашках-64 сярод юнакоў і дзяўчат 2008 г. н. і маладзей «Залатая восень». Перамагла каманда г. Гомеля (Мікіта Пінчук, Сяргей Астапаў, Данііл Свірыдаў, Інга Барашка, трэнер — Ганна Барашка).

З 23 да 25 кастрычніка адбыліся адкрытыя абласныя спаборніцтвы па шашках-64 «Белы кій» сярод навучэнцаў школ-інтэрнатаў у рамках акцыі «Прафсаюзы-дзецям». Перамагла каманда ДУА «Спецыяльная школа № 188 г. Мінск» у складзе Яраслава Ванзанка і Варвары Кажухар.

З 28 кастрычніка да 8 лістапада ў Манаўгаце (Турцыя) праходзіў маладзёжны чэмпіянат свету па шашках-64. 29 кастрычніка адбылася праграма бліц. Чэмпіёнамі свету ў сваіх узростах сталі Арцём Ціханаў і Вікторыя Нікалаева (да 27 гадоў). «Серабро» на рахунку Яўгеніі Швед (Д20), «бронза» — Георгія Тараніна, Марыі Таранінай (да 27), Юліі Швед (Д14) і Ганны Забалоцкіх (Д11). У хуткай праграме (рапід), якая прайшла 30.10.2025, залаты медаль выйграла Вікторыя Нікалаева. Сярэбранымі прызёрамі сталі Арцём Ціханаў, Яўгенія Швед і Ганна Забалоцкіх, бронзавы прызёр — Марат Леў (Ю20).

**№ 57** Кажухар В. — Верамеенка С.

**Белыя простыя:** e1, d2, h2, a3, e3, h4, a5 (7)

**Чорныя простыя:** f4, c5, e5, g5, f6, h6, h8 (7)

1.e1-f2 e5-d4 2.d2-c3 [у партыі было 2.f2-g3?]

2...f4:b4 [2...d4:b2 3.a3:c1 f4:d2 4.c1:e3] 3.a5:g7 h8:f6 4.h2-g3 c5-d4 5.a3-b4+

**№ 58**



**№ 58** Я. Івашка

**Белыя простыя:** b2, d4, h4, b6, c7, дамка e1(6)

**Чорныя простыя:** f4, a5, f6, дамка h8 (4)

**№ 59** Андрэеў Г.

**Белыя простыя шашкі:** d2, c3, b4, h4, c5, a7 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** f2, a5, e5, b6, e7, g7, d8 (7)

**№ 60** Кахно Э. — Асмалоўская А.

**Белыя простыя:** c1, b2, d2, f2, c3, g7 (6)

**Чорныя простыя:** a3, h4, a5, c5, e5, b6, e7 (7)

Партыя гулялася на маладзёжным чэмпіянаце свету па шашках-64 (у праграме рапід па бразільскай версіі). Белыя правялі прыгожую камбінацыю, знайдзіце яе.

1.f2-g3 h4:f2 2.d2-e3 f2:d4 3.c1-d2 a3:e3 4.g7-f8 d4:b2 5.f8:d6+

Наступныя тры камбінацыі складзеныя па правілах бразільскіх шашак вядучым рубрыкі.

**№ 61**

**Белыя простыя:** c1, c3, e3, g3, f4, e5 (6)

**Чорныя простыя:** a3, h4, a5, c5, b6, c7 (7)

1. c3-b4 h4:f6 2. b4:b8 f6-e5 3. f4:d6 b6-c5 4. d6:b4 a5:c3 5. b8-e5 a3-b2 6. c1:a3 c3-d2 7. e5-c3 d2:b4 8. a3:c5+

**№ 62**

**Белыя простыя:** e1, b2, d2, e3, f4, h4 (6)

**Чорныя простыя:** a3, c5, f6, c7, b8, дамка e7 (6)

1. f4-e5 f6:f2 2. e1:g3 a3:e3 3. g3-f4 e3:g5 4. h4:d4 b8-c7 5. d4-c5+

**№ 63**

**Белыя простыя шашкі:** e1, c3, e3, b4, c5 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** g3, f4, g5, a7, g7 (5)

1. c5-b6 a7:a3 2. e1-f2 f4:b4 3. f2:h8+

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выігрываюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

З лістоў чытачоў: «Дзякуем аўтарам, вядучаму і рэдакцыі за прапанаваныя нам доўгачаканыя заданні. Было вельмі цікава іх рашаць. З нецярпеннем чакаем чарговага выпуску», — пішуць Ф. Карпей і Л. Жыхар.

Праверце свае рашэнні: выпуск № 240 ад 23.10.2025.

№ 50 1. 34-30 25:23 2. 37-32 20:29 3. 32:03+

№ 52 1. 26-21 17:26 2. 27-22 18:27 3. 32:21 16:27 4. 35-30 24:44 5. 43-39 44:33 6. 38:07+

№ 53 1. e7-d8 c5:e7 2. c1-b2 b8:d6 3. d8-c7 d6:b8 4. f6:d8 h4:f6 5. d8:a3 b8-c7 6. b2-c3 c7-d6 7. a3:e7 f8:d6 8. c3-d4+

№ 54 1. f4-g5 h4:f6 2. c3-d4 f2:h4 3. d4-e5 f6:d4 4. d2-c3 b4:d2 5. c1:e7 d8:f6 6. a7-b8 c7-b6 7. b8-a7 f6-g5 8. a7:h6 h4-g3 9. h6-e3 g3-h2 10. e3-g1 a5-b4 11. e1-d2 b4-a3 12. d2-c3+

№ 55 1. h2-g3 f4:h2 2. h6:f4 e3:g5 3. c1:e3 d4:f2 4. c7-d8 a5:e5 5. c5-d6 e5:c7 6. d8:h6 f8:d6 7. h6:g1+

№ 56 1. 20-14 26:46 2. 14:01 32:21 3. 16:07 02:11 4. 19:08 46:02

5. 01-07 02:35 6. 07:49 33:24 7. 50-44 35-30 8. 44-39 [ПР 8.49-16 30-35 9.16-49]

8...30:43 9. 49:20 15:24 10. 48-43 24-30 11 .43-39 30-35 12. 39-34 35-40 13. 34:45+

Першыя дакладныя адказы даслалі: Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзель), І. Ананіч (Гродна), В. Арцюхін, Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе Мінск), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.).

Пішыце па адрасе: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталій ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

## 11 СНЕЖНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1934** год — нарадзіўся Анатоль Аляксандравіч Воінаў, беларускі архітэктар, гісторык архітэктуры, педагог, кандыдат архітэктуры (1967 г.), прафесар (1991 г.), заслужаны архітэктар Беларусі (1991 г.). З 1958 г. працаваў у інстытуце Белдзяржпраект, з 1985 года — дэкан архітэктурнага факультэта Беларускага політэхнічнага інстытута. Аўтар навуковых работ па гісторыі савецкай архітэктуры. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1980 г.).

У свеце

**1699** год — Пётр І зацвердзіў Андрэеўскі сцяг у якасці афіцыйнага сцяга расійскага ваеннага флоту. Свой выбар імператар тлумачыў тым, што менавіта ад апостала Андрэя Расія прыняла святое хрышчэнне, і такім чынам яму хацелася ўвекавечыць імя святога.

**1810** год — нарадзіўся Альфрэд дэ Мюсэ, французскі паэт, пісьменнік, член французскай акадэміі, класік французскай літаратуры. Аўтар цыкла паэм пад агульнай назвай «Ночы», драматычных твораў і знакамітага рамана «Споведзь сына стагоддзя».

**1950** год — нарадзіўся Аляксандр Міхайлавіч Татарскі, рэжысёр, прадзюсар, мастак-мультыплікатар. Заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі (2000 г.). Паставіў фільмы «Пластылінавая варона», «Падаў леташні снег», «Крылы, ногі і хвасты», «Следства вядуць Калабкі».

**1990** год — уступіў у сілу Дагавор паміж СССР і ЗША аб абмежаванні падземных выпрабаванняў ядзернай зброі ад 3 ліпеня 1974 г. і Дагавор паміж СССР і ЗША аб падземных ядзерных выбухах у мірных мэтах (падпісаны 28 мая 1976 г.).

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 129. Індэкс 63850. Зак. № 2692.

Нумар падпісаны ў 19.30 10 снежня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12